ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 98 (1632) | Аўторак, 12 снежня 1961 года | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

НАДЗЁННЫЯ ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ ХАРАВОГА МАСТАЦТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ. ◆ НА СУСВЕТНЫМ КАНГРЭСЕ ПРАФСАЮЗАЎ. ◆ **МАГІЛЁЎСКІ НАРОДНЫ...** ◆ КРЫТЫК ПРА КНІГУ КРЫТЫКА ◆ **ДА 140-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. А. НЯКРАСАВА.** ◆ З ДАЛЁКІХ ПАДАРОЖЖАЎ. ЗАКАНЧЭННЕ ГВІНЕЙСКІХ НАТАТАК В. ВОЛЬСКАГА.

КАБ ШЧАСЛІВА ЖЫЎ ЧАЛАВЕК

8 снежня закончыла сваю работу сёмая сесія Вярхоўнага Савета СССР пятага склікання. З заключным словам выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыня Дзяржплана СССР дэпутат В. Н. Новікаў. Затым Вярхоўны Савет аднагалосна прыняў Закон аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1962 год.

Пасля заключнага слова міністра фінансаў СССР дэпутата В. Ф. Гарбузава сесія зацвердзіла бюджэт краіны на чацвёрты год сямігодкі з улікам паправак Бюджэтных камісій палат і Эканамічнай камісіі Савета Нацыянальнасцей.

Аднагалосна прымаецца Закон аб Дзяржаўным бюджэце Саюза ССР на 1962 год і пастанова аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1960 год.

Пасля гэтага сесія перайшла да зацвярджэння Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутат М. П. Георгадзе. Дэпутаты зацвярджаюць Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, прынятыя ў перыяд паміж сесіямі.

З дакладам аб праекце асноў грамадзянскага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік выступіў старшыня Камісіі заканадаўчых меркаванняў Савета Саюза дэпутат Д. С. Палянскі.

— Ленінскія прынцыпы развіцця дзяржаўнасці ў перыяд будаўніцтва камунізма, — гаворыць дакладчык, — патрабуюць далейшага ўсебаковага разгортвання сацыялістычнай дэмакратыі, паляпшэння работы дзяржаўнага апарату, узмацнення народнага кантролю за яго дзейнасцю. У гэтай сувязі праект асноў грамадзянскага заканадаўства, распрацаваны ў адпаведнасці з новай Праграмай Камуністычнай партыі і рашэннямі XXII з'езда КПСС, закліканы адыграць важную ролю ў паспяховым вырашэнні задач камуністычнага будаўніцтва.

Затым з дакладам аб праекце асноў грамадзянскага судаводзення выступіў старшыня Камісіі заканадаўчых меркаванняў Савета Нацыянальнасцей дэпутат Д. Расулаў.

Дэпутаты, што выступалі ў спрэчках па гэтых дакладах, падкрэслівалі важнасць новых дакументаў для далейшага ўдасканалення савецкага грамадзянскага права, якое поўна адлюстроўвае адзінства асабістых і грамадскіх інтарэсаў савецкіх грамадзян.

Вярхоўны Савет аднагалосна прымае Закон аб зацвярджэнні асноў грамадзянскага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік і Закон аб зацвярджэнні асноў грамадзянскага судаводзення Саюза ССР і саюзных рэспублік.

На сумесных пасяджэннях палат 8 снежня прысутнічалі таварышы Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, Ф. Р. Казлоў, А. М. Касыгін, О. В. Куусінен, А. І. Мікаян, Д. С. Палянскі, М. А. Суслаў, М. С. Хрушчоў, М. М. Швернік, Ш. Р. Рашыдаў, У. В. Шчарбіцкі, П. Н. Дземічаў, Л. Ф. Ільічоў, Е. М. Панамароў, І. В. Спірыдонаў, А. М. Шалепін.

Дэпутаты і госці сустрэлі кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Вы бачыце простую дзяўчыну за работай. Гэта Мая Сімкова. Яна працуе ў грэбнечасальным цэху Мінскага камвольнага камбіната. «Залатыя рукі» — гаворыць пра яе члены калектыву.
Сёлета калектыў камбіната даў звыш плана на тры мільёны рублёў новых тканін. У гэтым ёсць значны ўклад і М. Сімковай. Нядаўна камсамольцы цэха выбралі перадавую работніцу сваім важаком.
Фота Ул. ДАГАЕВА.

НА ПАРАДКУ ДНЯ — ХАРАВОЕ МАСТАЦТВА

НАПЭЎНА, ніводнаму жанру музычнага мастацтва не ўдзяляецца ў нашай краіне столькі ўвагі, як харавому. Плённа працуюць выдатныя прафесіянальныя харавыя калектывы, ёсць шмат самадзейных хораў, што па сваіх выканаўчых якасцях набліжаюцца да прафесіянальных. Здаўна вядома любоў нашага народа да харавых спеваў. Ёсць трывалыя традыцыі калектыўнага стварэння песень. Усё гэта — удзячная глеба для росту харавога мастацтва.

Аднак паспяховаму развіццю харавога мастацтва ў нашай рэспубліцы яшчэ многае перашкаджае. Некаторыя хоры працуюць нерэгулярна, збіраюцца наспех за месяц-паўтара да чарговага агляду самадзейнасці і пасля яго зноў распадаюцца. Значная частка самадзейных хораў валодае вельмі нізкай выканаўчай культурай. У іх няма чысціні інтанацыі, якой-небудзь мастацкай накіраванасці, адсутнічае ўмельства карыстацца нюансамі і г. д. Хвалюе і вельмі нязначная колькасць самадзейных хораў акадэмічнага тыпу, боязь шматгалосага спявання, няправільнае разуменне народнай манеры выканання.

У сувязі з гэтым асабліва бачыш каштоўнасць ініцыятывы, якую праявілі дырыжорска - харавая кафедра і рэктарат Белдзяржкансерваторыі, Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі і Міністэрства культуры, склікаўшы ўпершыню ў Беларусі метадычную канферэнцыю выкладчыкаў харавога дырыжыравання. У канферэнцыі прынялі ўдзел былыя выпускнікі Беларускай кансерваторыі, якія працуюць цяпер у музычных і музычна-педагагічных вучылішчах, лепшыя дырыжоры-харавікі і выкладчыкі.

Карыснай і важнай была размова аб усім, што перашкаджае развіццю харавой справы ў нашай рэспубліцы.

Удзельнікі канферэнцыі слухалі лекцыі па гармоніі, сальфеджыо, па харавому дырыжыраванню ў Мінскім музычным вучылішчы, знаёміліся з выкладаннем харавой літаратуры, арганізацыяй школьнай практыкі, прысутнічалі на спецыяльных занятках у кансерваторыі, праслухалі рад дакладаў вядучых дзеячоў музычнага мастацтва Беларусі.

Абменьваючыся ўласным вопытам, яны разам з тым горача абмяркоўвалі надзённыя праблемы развіцця харавога мастацтва, выкрывалі недахопы. З трывогай гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі аб невысокім узроўні музычнай культуры нашых школьнікаў, дрэнных музычных густах моладзі. Кідаецца, напрыклад, у вочы, што на канцэртах класічнай музыкі рэдка ўбачыш маладых слухачоў. Неахвотна наведваюць яны заняткі школьных хораў. Надзвычай абмежаваныя музычныя густы праяўляюцца ў многіх пісьмах моладзі ў рэдакцыю радыёканцэртаў па заяўках.

Усё гэта з'яўляецца вынікам недаацэнкі музычнага выхавання ў школах. У Беларусі налічваецца звыш 14 тысяч школ, а настаўнікаў спеваў усяго 660. Да таго ж, большасць гэтых настаўнікаў не мае не толькі спецыяльнай, а нагул музычнай адукацыі.

У агульнаадукацыйных школах заняткі спеваў у першых—чацвёртых класах праводзяць класныя настаўнікі, і толькі з пятых — сёмых пачынаюцца лекцыі спецыяліста-музыканта (калі ёсць такі).

Пры такой сістэме вучні за першыя чатыры гады амаль не атрымліваюць ніякіх музычных ведаў і прыходзяць у пяты клас не толькі музычна не падрыхтаваныя, але часта з перакананнем, што спевы — прадмет неабавязковы і непатрэбны.

Харавое спяванне ў школах мае надзвычай важнае значэнне для правільнага развіцця музычнага густу. Але якраз арганізацыя вучнёўскіх хораў з'яўляецца адным з самых «вузкіх месц» музычна-выхаваўчай работы ў школах. І прычына таму не толькі ў адсутнасці кваліфікаваных педагогаў-харавікоў, але і ў абыякавасці з боку кіраўніцтва школ.

У развіцці харавога мастацтва Беларусь па цэламу раду прычын значна адстала ад сваіх суседзяў— РСФСР, Украіны і рэспублік Прыбалтыкі. Цяпер гэты разрыў скарачаецца, але для таго, каб яго поўнасцю ліквідаваць, патрэбна вялікая колькасць дырыжораў-харавікоў, настаўнікаў спеваў і музыкі ў школах, кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, а галоўнае — кваліфікаваных педагогаў для музычных і музычна-педагагічных вучылішчаў. Пакуль што справа з педагагічнымі кадрамі ў рэспубліцы пакідае жадаць многа лепшага. Усе без выключэння музычныя вучылішчы адчуваюць вострую патрэбу ў педагогах з вышэйшай адукацыяй і, у першую чаргу, у педагогах па харавому дырыжыраванню. У Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы з 16 педагогаў дырыжорска-харавога аддзялення толькі трое маюць кансерваторскую адукацыю. Між тым, з усіх выпускнікоў Белдзяржкансерваторыі па дырыжорска-харавой кафедры ў пасляваенныя гады (крыху больш 50 чалавек) палова засталася на рабоце ў Мінску, некаторыя працуюць не па спецыяльнасці і толькі частка займаецца педагагічнай і выканаўчай дзейнасцю ў абласных цэнтрах Беларусі. Нам здаецца, што наборы студэнтаў-харавікоў у кансерваторыю павінны быць намнога павялічаны, а пераважную частку выпускнікоў адзінай у Беларусі музычнай навучальнай установы неабходна пасылаць на перыферыю.

Зараз сёе-тое робіцца для падрыхтоўкі выкладчыкаў музыкі і спеваў. У педагагічных інстытутах арганізаваны музычныя факультэты, павялічваецца колькасць навучэнцаў у музычна-педагагічных вучылішчах (на жаль, іх у Беларусі яшчэ толькі два), пашыраецца прыём ва ўсе музычныя вучылішчы Беларусі. З цягам часу нястача настаўнікаў спеваў і дырыжораў-харавікоў будзе ліквідавана, але пакуль што ў іх выхаванні ёсць нямала цяжкасцей і непаладак. Вельмі мала прыстасаваных памяшканняў, інтэрнатаў. У найбольш цяжкім становішчы Брэсцкае музычнае вучылішча, якое мае толькі невялікую частку патрэбных для лекцый класаў, зусім не мае памяшканняў для індывідуальных заняткаў, інтэрната і г. д.

Для дырыжорска-харавых аддзяленняў няма добра распрацаваных вучэбных праграм, метадычных дапаможнікаў, музычнай літаратуры. Нельга згадзіцца з тым, што заняткі ў музычна-педагагічных вучылішчах рэспублікі праводзяцца па значна заніжаных праграмах 1952 года, якія патрабуюць карэннага перагляду.

Мала выдаецца новых, больш сучасных дапаможнікаў, дзе быў бы шырока і поўна абагульнены вопыт працы лепшых харавых калектываў Савецкага Саюза, падручнікаў па харавому дырыжыраванню, хоразнаўству, аранжыроўцы, метадыцы работы з хорам. Зусім няма падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, у якіх быў бы скарыстаны беларускі матэрыял і з якіх можна было б даведацца аб дзейнасці і выканаўчых прынцыпах такіх калектываў, як Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Беларускай ССР, Народны ансамбль песні і танца, народны хор сяла Азершчына і многіх іншых вядомых прафесіянальных і самадзейных харавых калектываў рэспублікі. У нас ёсць нямала выдатных дзеячоў харавога мастацтва, ёсць

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Нарада-семінар культработнікаў

У Мінску з 7 па 9 снежня праходзіла рэспубліканская нарада-семінар старшынь праўленняў клубаў, палацаў і дамоў культуры арганізацый прафсаюзаў.

З дакладам аб задачах культурна-асветных устаноў па выкананню рашэнняў XXII з'езда КПСС выступіла сакратар Беларускага савета прафсаюзаў М. Дубкова.

Кіраўнікі культурна-асветных устаноў прафсаюзаў праслухалі лекцыі аб шляхах стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, маральным кодэксе будаўніка камунізма, міжнародным становішчы Савецкага Саюза, абмяняліся таксама вопытам работы.

Творчая справаздача

На працягу некалькіх дзён працоўныя Мінска знаёміліся з выстаўкай твораў брэсцкіх мастакоў П. Данелія, І. Фяцісава, І. Рудчыка, В. Чарнышова і іншых. Яны прадставілі для агляду каля 150 работ. Гэта — карціны, пейзажы, партрэты, скульптура, графіка. Асноўная тэма твораў — гераічная стваральная праца савецкіх людзей, іх самаадданая барацьба за пабудову камуністычнага грамадства.

П. САЛАЎЕЙ.

ПАСЛЯ З'ЕЗДА КНІГА ПАВІННА РАДАВАЦЬ

Днямі ў Дзяржаўным выдавецтве БССР адбыўся адкрыты партыйны сход, прысвечаны вынікам работы XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і тым задачам, якія сёння стаяць перад выдавецтвам.

З дакладам аб выніках XXII з'езда КПСС і задачах партыйнай арганізацыі выдавецтва выступіў дэлегат з'езда, міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў. Дакладчык ахарактарызаваў гістарычнае значэнне XXII з'езда партыі.

Работнікі культуры, падкрэсліў Р. Я. Кісялёў, у тым ліку і работнікі выдавецтва, выконваюць важнейшую задачу — нясуць у масы вялікія ідэі партыі, дапамагаюць партыі фарміраваць у савецкіх людзей камуністычны светапогляд.

Важнейшым абавязкам выдавецтва цяпер з'яўляецца шырокая прапаганда гістарычных рашэнняў XXII з'езда партыі.

Асабліва актуальная цяпер барацьба за высокі ідэйны і мастацкі ўзровень літаратуры, якая выдаецца. У нас, гаворыць дакладчык, яшчэ нярэдка выдаюцца пасрэдныя, напісаныя штампаванай мовай кнігі, сумныя па зместу, шэрыя, невыразныя па афармленню. Нам трэба даваць чытачу такую кнігу, якая задавальняла б духоўныя запатрабаванні, абуджала да творчай працы на карысць грамадства, узнімала чалавека на ступеньку вышэй, пашырала яго кругагляд.

Пытанні паляпшэння работы выдавецтва, павышэння ідэйнага і мастацкага ўзроўню літаратуры, больш поўнага і глыбокага асвятлення барацьбы нашага народа за ажыццяўленне рашэнняў XXII з'езда КПСС былі ў цэнтры ўвагі ўсіх таварышаў, якія выступалі на сходзе.

У прыватнасці, гаварылася аб неабходнасці павышэння патрабавальнасці да аўтараў. Галоўны рэдактар выдавецтва І. Казека падкрэсліў, што рэдакцыям трэба старанна адбіраць рукапісы для апублікавання, весці карпатлівую работу з аўтарамі па паляпшэнню якасці рукапісаў. Сур'ёзна павінна быць паляпшана рэцэнзаванне рукапісаў. Часта бывае так, што рэцэнзент, не жадаючы псаваць адносін з аўтарам, дае вельмі агульную, неканкрэтную ацэнку яго рукапісу, не падкрэслівае яго недахопаў. Гэта дрэнная паслуга і аўтару і выдавецтву.

Наш савецкі чытач хоча мець больш добрых, цікавых кніг. Каб задаволіць яго патрабаванні, выдавецтву трэба значна павысіць сваю арганізуючую ролю, распрацоўваць новыя, актуальныя тэмы і даручаць напісанне кніг, брашур на гэтыя тэмы кваліфікаваным аўтарам. Пра гэта гаварыў у сваім выступленні дырэктар выдавецтва З. Матузаў. Ён таксама падрабязна спыніўся на пытаннях планавання выпуску літаратуры. Тав. Матузаў падверг сур'ёзнай крытыцы работу некаторых рэдакцый, якія непатрабавальна ставяцца да рукапісаў. Нам трэба, сказаў ён, сур'ёзна павысіць ролю і адказнасць рэдактара пры падрыхтоўцы рукапісаў да друку. Немалаважнае значэнне для далейшага павышэння ідэйнага і мастацкага ўзроўню выпускаемай літаратуры мае паляпшэнне работы галоўнай рэдакцыі выдавецтва. Тав. Матузаў лічыць, што Міністэрства культуры БССР павінна хутчэй вырашыць пытанне аб пашырэнні галоўнай рэдакцыі за лік прыцягнення ў яе на грамадскіх пачатках спецыялістаў па розных галінах ведаў.

Загадчыкі рэдакцый тт. Цярэшчанка, Чарняк, Татур, Гуціеў прывялі канкрэтныя прыклады нездавальняючай работы нашых паліграфічных прадпрыемстваў. Друкарня выдавецтва «Звязда», паліграфкамбінат імя Я. Коласа многія кнігі і нават брашуры выпускаюць вельмі доўга, зрываюць іх своечасовы выхад у свет, а нярэдка тэрміны выпуску невялікіх брашур па віне паліграфістаў настолькі зацягваюцца, што гэтыя брашуры трацяць сваю актуальнасць.

Сур'ёзныя папрокі былі зроблены ў адрас Галоўнага ўпраўлення паліграфічнай прамысловасці і выдавецтваў Міністэрства культуры БССР за яго празмернае захапленне «папяровым метадам кіраўніцтва». Сход падверг крытыцы работу кнігагандлёвых арганізацый, якія часта не ведаюць попыту чытачоў на тую ці іншую кнігу, няправільна вызначаюць яе тыраж, спяшаюцца з прадстаўленнем выдавецтву заказаў на многія кнігі і, значыць, тармозяць своечасовы выхад іх у свет.

Адкрыты партыйны сход выдавецтва адзінадушна адобрыў рашэнні XXII з'езда КПСС і ў прынятай пастанове вызначыў практычныя задачы калектыву па ажыццяўленню і далейшаму ўздыму работы выдавецтва.

ПРАЦАВАЦЬ З НАТХНЕННЕМ

Ва ўсіх тэатральных калектывах рэспублікі праходзяць адкрытыя партыйныя сходы з адным парадкам дня: вынікі XXII з'езда КПСС і задачы творчых работнікаў.

Цікавы і змястоўны быў адкрыты партыйны сход у Віцебскім тэатры імя Якуба Коласа. З дакладам аб выніках XXII з'езда Камуністычнай партыі выступіў першы сакратар Віцебскага гаркома партыі, дэлегат з'езда В. Сініцын.

Удзельнікі сходу ў сваіх выступленнях ухвалялі новую Праграму партыі і гаварылі аб сваёй творчай рабоце, аб планах на будучае.

Народны артыст рэспублікі, дырэктар тэатра А. Шэлег сказаў, што калектыў тэатра працаваў перад з'ездам з творчым уздымам. Замест двух па плану арыгінальных беларускіх спектакляў выпушчана тры — «Выгнанне блудніцы», «Крыніцы» і «Справа яе жыцця». А. Шэлег заклікаў калектыў тэатра і ў далейшым актыўна працаваць з беларускімі драматургамі і пісьменнікамі.

Галоўны рэжысёр тэатра Ю. Шчарбакоў сказаў, што задача калектыву — не толькі захаваць высокі энтузіязм, які панаваў сярод усіх работнікаў тэатра напярэдадні XXII з'езда партыі, але і працаваць з яшчэ большым напружаннем творчых сіл.

Актыўна . прайшлі адкрытыя партыйныя сходы ў абласных тэатрах Гомеля і Магілёва.

У Гомельскім тэатры з дакладам выступіў сакратар партарганізацыі М. Мядзведзеў. Гаворачы аб прынятых на з'ездзе вялікіх планах пабудовы камуністычнага грамадства, ён спыніўся на тых задачах, якія павінны вырашаць работнікі мастацтва ў наш час.

Акцёры М. Марухаў, А. Яцкевіч, А. Каменскі, галоўны рэжысёр Л. Эльстон, работнік электрацэха А. Рэзнікаў і іншыя ўзнімалі надзённыя пытанні жыцця тэатра. Была выказана прапанова правесці ў бліжэйшы час дыскусію аб выпушчаных у гэтым годзе спектаклях.

На сходзе ў Магілёўскім абласным тэатры творчыя работнікі шырока абмяркоўвалі вынікі перадз'ездаўскіх справаздачных гастролей тэатральнай трупы ў Мінску і планы работы над новымі пастаноўкамі.

ХТО ЛЕПШ, ХТО ЦІКАВЕЙ...

Шэсць дзён працягваўся ў Мінску агляд агітацыйна-мастацкіх брыгад Беларусі. Гэты цікавы і вельмі карысны агляд закончыўся вялікім заключным канцэртам, у якім прынялі ўдзел чатыры лепшых самадзейных калектывы рэспублікі. Так, выступленне мастацкай агітбрыгады Лёзненскага Дома культуры Віцебскай вобласці «На карысць народа» было прысвечана прапагандзе рашэнняў XXII з'езда партыі; агітбрыгада Стаўбцоўскага Дома культуры Мінскай вобласці паказала тэатралізаваны агляд «З Вожыкам у калгасе». Змястоўнымі і выразнымі былі таксама выступленні мастацкіх агітбрыгад Ашмянскага і Рэчыцкага раённых Дамоў культуры.

У заключэнне ўдзельнікі канцэрта, якіх вы бачыце на здымку, выканалі песню «Марш брыгад камуністычнай працы» віцебскага самадзейнага кампазітара В. Смірнова.



ФОРУМ САЛІДАРНАСЦІ РАБОЧЫХ СВЕТУ

Некалькі дзён у Маскве, у Крамлёўскім палацы з'ездаў, працуе пяты Сусветны кангрэс прафсаюзаў. У рабоце кангрэса прымае ўдзел 918 дэлегатаў — прадстаўнікі 94 краін свету. Яны сабраліся на кангрэс, каб разам абмеркаваць надзённыя праблемы міжнароднага рабочага руху, салідарнасці працоўных, іх адзінства ў барацьбе за мір, супраць пагрозы новай вайны.

З дакладам аб дзейнасці Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў і сучасных задачах прафсаюзных арганізацый у барацьбе за мір, супраць імперыялізму, за поўнае раззбраенне, за абарону эканамічных і сацыяльных патрабаванняў працоўных выступіў генеральны сакратар федэрацыі Луі Саян. Аб дзейнасці і салідарнасці прафсаюзных арганізацый у барацьбе народаў за ліквідацыю каланіялізму гаварыў у дакладзе Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў Ібрагім Захарыя. На працягу некалькіх дзён удзельнікі кангрэса абмяркоўвалі даклады.

Аб вялікіх зменах, якія адбыліся на афрыканскім кантыненце, аб англа-амерыканскім імперыялізме, які пераатварыў Іран у каланіяльную краіну, аб вялікіх перспектывах у рабоце прафсаюзных арганізацый Чэхаславакіі расказалі кангрэсу генеральны сакратар Нацыянальнага саюза Маўрытаніі Жан Сао, сакратар Цэнтральнага савета прафсаюзаў Ірана Рэза Руста, старшыня Цэнтральнага савета прафсаюзаў Чэхаславакіі Францішак Зупка і многія іншыя.

Вітаючы ўдзельнікаў кангрэса, старшыня ВЦСПС В. В. Грышын сказаў:

— Савецкі народ па праву ганарыцца сваімі выдатнымі поспехамі ў будаўніцтве новага жыцця. У гэтых поспехах немалая роля належыць рабочаму класу нашай краіны — вядучай сіле савецкага грамадства. Вялікае месца ў жыцці краіны займаюць прафесіянальныя саюзы. За гады Савецкай улады нашы прафсаюзы вырасліі больш чым у 30 разоў і цяпер аб'ядноўваюць 63 мільёны працоўных.

Аб праграме дзеянняў Фронту нацыянальнага вызвалення Паўднёвага В'етнама расказаў прысутным Нгуен Ван Там.

— Наш вораг—амерыканскі імперыялізм — з'яўляецца найбольш небяспечным ворагам рабочага класа ўсяго свету, — сказаў ён.

Пад бурныя апладысменты пасланец паўднёвав'етнамскіх патрыётаў перадаў прэзідыуму кангрэса чырвонаблакітны сцяг Фронту нацыянальнага вызвалення і вялікую металічную вазу, якая зроблена з гільзы снарада амерыканскай 105-міліметровай гарматы, што страляла па мірных вёсках Паўднёвага В'етнама.

Думкі многіх удзельнікаў кангрэса выказаў старшыня федэрацыі Цэйлона М. Г. Мендзіс. Ён сказаў:

— Сусветны кангрэс прафсаюзаў павінен стаць паваротным пунктам у барацьбе за поўную ліквідацыю каланіялізму, заваяванне нацыянальнай незалежнасці, міру і сацыяльнага прагрэсу.

Прафсаюзны дзеяч Гватэмалы Карлос Лопес выказаў поўную згоду з праектам праграмы дзеянняў прафсаюзаў і вынес прапанову аб тым, каб пяты кангрэс прыняў рэзалюцыю, якая б заклікала працоўных усіх краін прадэманстраваць салідарнасць з кубінскай рэвалюцыяй.

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі кангрэса выступленне лётчыка-касманаўта Г. Цітова.

Многія дэлегаты расказалі кангрэсу аб умовах жыцця рабочых, аб барацьбе працоўных за свае сацыяльныя правы.

З вялікай увагай праслухалі пасланцы працоўных пяці кантынентаў зямнога шара прамову Мікіты Сяргеевіча Хрушчова. Кіраўнік Савецкага ўрада гаварыў аб выніках XXII з'езда КПСС, аб галоўным пытанні сучаснасці — барацьбе за поўнае выключэнне войнаў з жыцця чалавецтва.

— Рабочы клас — самы перадавы клас сучаснага грамадства, выразнік сапраўдных ідэалаў людзей працы і найбольш актыўны змагар за іх ажыццяўленне, — сказаў М. С. Хрушчоў. — Надышоў той перыяд, калі яго вялікасць рабочы клас настолькі вырас, узмацнеў і дабіўся такіх перамог, што ён можа вызначаць ход гістарычнага развіцця на карысць міру, дэмакратыі і сацыялізма. Магутныя сілы рабочага класа, сілы сацыялізма няўхільна цясняць стары эксплуататарскі свет.

М. С. Хрушчоў закончыў сваю прамову здравіцай у гонар міжнароднага рабочага класа — вядучай сілы сучаснасці, у гонар салідарнасці, адзінства і брацтва працоўных усіх краін, у гонар міру на зямлі.

Яркая, хвалюючая прамова М. С. Хрушчова неаднаразова перарывалася працяглымі, бурнымі апладысментамі. Пасля яе заканчэння кіраўнік Савецкага ўрада праходзіць у прэзідыум кангрэса і паціскае руку старшыні. У зале гучыць «Інтэрнацыянал» на французскай мове. Яго падхапілі ўсе прысутныя — на іспанскай, італьянскай, англійскай, рускай і на мовах многіх іншых краін і народаў зямлі. Старшынствуючы Бенуа Фрашон звяртаецца да М. С. Хрушчова. Прывітанні, якія гучалі тут, гаворыць ён, з'яўляюцца выражэннем удзячнасці працоўных усяго свету да тых, хто падрыхтаваў і ажыццявіў Кастрычніцкую рэвалюцыю, ідэі якой жывуць у сэрцах соцень мільёнаў працоўных. Ніколі прывітанні не былі такія шчырыя, як тут. Перадайце, гаворыць Фрашон, гэтую ўдзячнасць Савецкаму ўраду, народу Савецкага Саюза.

У вялікай зале гучаць воклічы на розных мовах: «Няхай жыве Савецкі Саюз!», «Далоў імперыялізм янкі!», «Няхай жыве Мікіта Хрушчоў!», «Няхай мацнее мір ва ўсім свеце!».

НА ПАРАДКУ ДНЯ — ХАРАВОЕ МАСТАЦТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

рад друкаваных прац аб беларускай харавой музыцы, ёсць паліграфічная база, і таму выданне такога метадычнага дапаможніка можна здзейсніць у самы кароткі тэрмін і на высокім прафесіянальным узроўні. Патрэбна толькі неадкладна арганізаваць аўтарскі калектыў і ўключыць выданне дапаможніка ў зытворчыя планы Белдзяржвыдавецтва на самы бліжэйшы час. Пажадана таксама, каб рэдакцыя музычнай літаратуры выдавецтва павялічыла тыражы і паскорыла выпуск у свет лепшых харавых твораў беларускіх кампазітараў і хрэстаматый па беларускай харавой літаратуры.

Наспела неабходнасць, каб рэспубліканскі метадычны кабінет з дапамогай кансерваторыі, Саюза кампазітараў і Камітэта па радыёвяшчанню наладзіў серыю магнітафонных запісаў у адпаведнасці з праграмай заняткаў па харавой літаратуры і рассылку іх у музычныя вучылішчы рэспублікі ў якасці вучэбных дапаможнікаў.

Надзвычай важнай справай у выхаванні дырыжораў-харавікоў з'яўляецца зытворчая практыка навучэнцаў, іх непасрэдная праца з вучнямі школ на занятках у класах. Аднак нярэдка здараецца, што навучэнец музычнага вучылішча, які за гады вучобы атрымаў пэўныя веды і набыў некаторыя дырыжорскія навыкі, трапляе на практыку ў клас да «выкладчыка» музыкі з былых баяністаў, трубачоў ці кларнетыстаў, які вельмі цьмяна ўяўляе сабе тэхніку дырыжыравання і методыку заняткаў. Зразумела, што практыка пад наглядам такога «кіраўніка» мала чаго можа даць навучэнцу, а між тым ад яго патрабуюць умельства праводзіць заняткі з хорам, чытаць лекцыі па тэорыі музыкі, сальфеджыо і слуханню музыкі.

Заслугоўвае ўвагі практыка Гродзенскага музычна-педагагічнага вучылішча, якое замацавала сваіх навучэнцаў за харавымі калектывамі школ горада, дапамагло наладзіць работу гэтых хораў, і, такім чынам, атрымала добрую базу для зытворчай практыкі. Плённыя вынікі дае замацаванне навучэнцаў-харавікоў за асобнымі самадзейнымі харавымі калектывамі, якое служыць на карысць як навучэнцам, так і самадзейным артыстам.

Яшчэ адной карыснай формай дзейнасці дырыжорска-харавых аддзяленняў музычных вучылішчаў магла б з'явіцца арганізацыя агульнагарадскіх дзіцячых хораў і хораў настаўнікаў школ з абавязковым наведваннем іх заняткаў усімі выкладчыкамі музыкі і спеваў. Калі б паставіць справу так, то можна было б вырашыць пытанне зытворчай практыкі навучэнцаў і адначасова значна пасунуць наперад агульнае развіццё харавога мастацтва.

Яшчэ адна цяжкасць сустракаецца на шляху дырыжорска-харавых аддзяленняў. Гэта — узрост паступаючых. У пераважнай большасці паступаюць учарашнія школьнікі ва ўзросце 15—16 год, якія толькі што скончылі 7—8 класаў. Яны не маюць ніякай спецыяльнай музычнай падрыхтоўкі, не зусім уяўляюць сабе цяжкасці сваёй будучай прафесіі і, часцей за ўсё, не могуць спяваць, таму што іх былыя альты і дысканты яшчэ толькі пераходзяць у ломкія барытоны і тэнары.

І вось такога юнака, які і сам яшчэ не можа спяваць у хоры і не мае ніякага выканаўчага вопыту, з першага ж курса пачынаюць вучыць, як кіраваць хорам. Акрамя гэтага, ён павінен авалодаць усімі музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі, прайсці курс ігры на фартэпіяна, добра ведаць харавую літаратуру, засвоіць методыку масавай музычнай работы, хораазнаўства, тэхніку дырыжыравання і яшчэ цэлы рад дысцыплін. Не ўсе з паступіўшых у музычныя вучылішчы могуць справіцца з такой нагрузкай, некаторыя губляюць упэўненасць і адсейваюцца. Другія, сяк-так закончыўшы чатырохгадовы курс, усё ж не становяцца дырыжорамі-харавікамі, а ўладкоўваюцца на працу ў якасці выкладчыкаў музычна-тэарэтычных дысцыплін ці педагогаў па фартэпіяна (патрэба ў такіх педагогах надзвычай вялікая і ўладкавацца на работу можна літаральна ўсюды).

Такім чынам «перакваліфікоўваецца» яшчэ некаторая частка выпускнікоў дырыжорска-харавых аддзяленняў, якія трапілі ў вучылішчы, як след не разабраўшыся ў сваіх імкненнях. Тут значна дапамагло б адкрыццё падрыхтоўчага курса для дырыжорска-харавых аддзяленняў музычных вучылішчаў і арганізацыя ў Мінску ці любым другім горадзе рэспубліканскага харавога вучылішча, дзе маглі б займацца з самага ранняга ўзросту музычна адораныя дзеці.

Педагагічная дзейнасць выкладчыкаў-харавікоў заўсёды бывае цесна звязана з работай у самадзейнасці і таму няма нічога дзіўнага, што ўдзельнікі метадычнай канферэнцыі многа і горача гаварылі аб надзённых пытаннях развіцця харавой самадзейнасці. Так, напрыклад, вельмі жывую рэакцыю дэлегатаў выклікаў змястоўны, навукова абгрунтаваны даклад народнага артыста БССР Г. Цітовіча аб спецыфіцы работы хормайстра з народным хорам, які закрануў праблемы развіцця народнага мастацтва, захавання яго традыцый і г. д.

Многія актуальныя пытанні харавой справы былі грунтоўна разгледжаны і ў іншых выступленнях. Выкладчыкі і навучэнцы дырыжорска-харавых аддзяленняў прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці рэспублікі, аказваюць дзейсную дапамогу мастацкай самадзейнасці, наладжваюць вялікую колькасць канцэртаў і лекцый у рабочых клубах, калгасных дамах культуры і універсітэтах мастацкага выхавання; на грамадскіх асновах адкрылі некалькі бясплатных музычных школ на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і школах-інтэрнатах; збіраюць лепшыя ўзоры музычнай народнай творчасці і робяць яшчэ шмат самых разнастайных карысных спраў.

Метадычная канферэнцыя была вельмі карыснай не толькі таму, што вырашыла значную частку важных і спрэчных пытанняў развіцця харавога мастацтва, а другую частку паставіла на разгляд адпаведных устаноў, але і таму, што ўдзельнікі канферэнцыі абагульнілі свой багаты вопыт, падзяліліся ім са студэнтамі-харавікамі Белдзяржкансерваторыі, вызначылі цэлы рад мерапрыемстваў для ўздыму харавой справы ў Беларусі. Можна спадзявацца, што такія канферэнцыі стануць рэгулярнымі, прыцягнуць самыя шырокія колы кіраўнікоў самадзейных харавых калектываў і прынясуць вялікі плён для развіцця беларускага музычнага мастацтва.

Д. ЖУРАЎЛЁЎ.

ФАТАГРАФІІ, ДАКУМЕНТЫ, ПІСЬМЫ

У Літаратурны музей Якуба Коласа паступаюць новыя матэрыялы, фатаграфіі, дакументы, пісьмы, ненадрукаваныя творы паэта.

Нядаўна, напрыклад, у музей перадаў пісьмо Мікалай Іванавіч Міцкевіч, які працуе у Акадэміі навук БССР. У час Айчыннай вайны Мікалай Іванавіч знаходзіўся на фронце. Туды і прыслаў яму пісьмо Якуб Колас з Ташкента. У ім паэт піша аб мужнасці савецкіх воінаў, аб тым, што нямецка-фашысцкія захопнікі будуць разгромлены.

З Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя Леніна паступіў здымак: Янка Купала і Якуб Колас разам з беларускімі пісьменнікамі Міхасём Чаротам, Цішкам Гартным і Змітракам Бядулем.

Жонка прафесара Маскоўскага універсітэта Б. Бенкергейма перадала рукапісы першай рэдакцыі паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка», а жонка вядомага ў свой час вучонага-географа Аркадзія Смоліча, Аляксандра Смоліч, перадала некалькі да гэтага часу невядомых фатаграфій Якуба Коласа 20-х гадоў. Новыя дакументы аб педагагічнай дзейнасці Якуба Коласа ў Белдзяржуніверсітэце паступілі з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР. Сярод іх кароткая аўтабіяграфія Якуба Коласа, а таксама тры заявы, якія паэт пісаў у дэканат.

Музей ва апошні час папоўніўся творамі Якуба Коласа, выдадзенымі ў Польшчы, Чэхаславакіі, Германіі, Манголіі..

М. ЖЫГОЦКІ.

ВЫСТАЎКА МАСТАКА-ГРАФІКА

Амаль кожны месяц у Віцебскім педагагічным інстытуце наладжваецца паказ работ прафесіянальных і самадзейных мастакоў. Зараз тут адкрыта справаздачная выстаўка твораў выкладчыка кафедры малюнка і жывапісу Віцебскага інстытута, члена Саюза мастакоў БССР Г. Клікушына.

Гэты мастак працуе галоўным чынам у галіне графікі. Не так даўно ён удзельнічаў у выстаўцы «Графіка Беларусі», якая экспанавалася ў Рызе.

На сваю справаздачную выстаўку Г. Клікушын прадставіў звыш 200 работ. Асабліва выразныя яго гравюры, яны цікавыя і па зместу і па колеру. На некаторых з іх адлюстраваны індустрыяльныя пейзажы Віцебска і вобласці, аблічча новых вуліц і плошчаў абласнога горада, маляўнічыя куткі прыроды беларускай зямлі. Гэта—гравюры «Над Дзвіной», «Восень», «Помнік Ул. І. Леніну», «Вуліца Талстога», «Мост» і інш.

Значнае месца на выстаўцы займаюць ілюстрацыі да літаратурных твораў, выдадзеных Белдзяржвыдавецтвам. Мы бачым добра выкананыя вокладкі кніг Я. Коласа, Я. Купалы, П. Панчанкі, П. Галавача, К. Чорнага, Ул. Дубоўкі, кніг украінскіх, латышскіх, польскіх, балгарскіх, кітайскіх і іншых аўтараў.

Акрамя таго, на выстаўцы нямала эцюдаў, плакатаў і замалёвак алоўкам.

Выстаўка карыстаецца поспехам.

В. ВІНАГРАДАЎ.

Шлях скульптара

У выдавецтве Акадэміі мастацтваў СССР выйшла з друку манаграфія Ф. Рагінскай аб творчай дзейнасці аднаго з майстроў беларускага выяўленчага мастацтва З. І. Азгура.

Аўтар грунтоўна аналізуе першыя творчыя крокі пачынаючага скульптара, падкрэслівае ролю і значэнне ў яго фарміраванні М. Керзіна, які зрабіў значны ўплыў на выхаванцаў Віцебскага мастацкага тэхнікума, сярод якіх быў і З. Азгур. Яна ілюструе свае сцвярджэнні перакайаўчымі прыкладамі першых творчых поспехаў З. Азгура, такімі, як «Ліцейшчык» (1925 г.), дзе ўжо відаць умельства маладога скульптара пластычна бачыць і выяўляць чалавечы твар з яго падабенствам і характарам.

«У гады навучання ў тэхнікуме, — піша Ф. Рагінская,—З. Азгур вучыўся прагна, запоем. Акрамя заданняў па курсу тэхнікума, ляпіў мноства партрэтаў сваіх сяброў, знаёмых».

Яшчэ будучы студэнтам, Азгур удзельнічае ў Першай усебеларускай мастацкай выстаўцы ў 1925 годзе. Работы яго былі станоўча ацэнены. З гэтага часу пачынаецца сістэматычны ўдзел маладога таленавітага скульптара ў перыядычных выстаўках беларускіх мастакоў, што кладзе пачатак яго актыўнай творчай і грамадскай дзейнасці.

Ад першых вопытаў у партрэтным жанры, З. Азгур крок за крокам авалодваў майстэрствам пластычнага ўвасаблення вобразаў выдатных вучоных, дзеячоў культуры і навукі далёкага мінулага і сваіх сучаснікаў. Намаганні мастака з кожным разам усё больш станавіліся прыкметнымі на агульным фоне маладой савецкай беларускай скульптуры. На кожнай з работ відаць пошукі рэалістычнай закончанасці твару чалавека, яго знешняга падабенства і характарыстыкі грамадскай дзейнасці. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны Азгур прыходзіць як майстар партрэта, прафесіянальныя якасці якога станоўча вылучаліся на агульным фоне перадваеннай беларускай скульптуры. Партрэты Гракха Бабеха, Сярго Арджанікідзе, А. Бразера, Змітрака Бядулі з'явіліся значным укладам у развіццё беларускага мастацтва.

Асабліва актывізуецца творчасць З. Азгура, піша Ф. Рагінская, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Цыкл партрэтаў Герояў Савецкага Саюза, створаных у дні вайны, сапраўды з'яўляецца жывым летапісам гераічнай народнай барацьбы з гітлераўскімі полчышчамі.

Скульптар з вялікім натхненнем працуе над партрэтамі беларускіх партызан, праслаўленых воінаў Савецкай Арміі. Любоў мастака да чалавека, які ішоў на фронт і ахвяроўваў жыццём у імя перамогі над ворагам Радзімы, з асаблівай сілай кранала сэрца.

Цыкл партрэтаў Герояў Савецкага Саюза — снайпера Фядоса Смалячкова, бацькі Міная, В. Казлова, капітана М. Гастэлы, В. Таталіхіна, А. Крывашэіна, партызанкі Патоцкай — адлюстроўвае веліч савецкага народа, яго нескаронасць і непераадольную сілу.

Партрэты Герояў Савецкага Саюза — А. Радзімцава, А. Малодчага і М. Сільніцкага, піша Ф. Рагінская, вылучаюцца з гэтага цыкла высокім майстэрствам. Па сваёй пластычнай выразнасці яны лепшыя з галерэі вобразаў савецкай скульптуры.

Савецкі чалавек, смелы і мужны, усведамляючы сваё месца ў агульным страі на пярэднім краі барацьбы народа за ажыццяўленне сваёй вялікай мэты, становіцца асноўным героем творчасці З. Азгура не толькі гэтага перыяду, але і наступных гадоў.

Пластычная гранічнасць і глыбіня зместу партрэтаў ваеннага часу ўласцівы як тым з іх, што стаяць у музеях, так і тым, што пастаўлены на вуліцах і плошчах гарадоў і сёл. Гэтыя партрэты спалучаюць у сабе, — сцвярджае аўтар кнігі,—якасці манументальнай і ў той жа час станковай скульптуры. Станковы партрэт, прызначаны для музейнай экспазіцыі, не губляе сваёй сілы ўздзеяння, будучы вынесены на плошчу або вуліцу, ва ўмовах вялікіх маштабаў прасторы. Аўтар кнігі лічыць, што для савецкай мастацкай культуры, у тым ліку і для скульптуры, характэрны эпічны пачатак. Савецкімі майстрамі створаны новыя ўзоры шырока вядомых эпічных твораў. Сюды можна аднесці і галерэю бюстаў-партрэтаў З. Азгура перыяду вайны, якія паказваюць людзей-герояў, нашых сучаснікаў.

У раздзеле кнігі, прысвечаным творчасці канца саракавых і пяцідзесятых гадоў, аналізуюцца творы разнастайных жанраў, у якіх давялося працаваць З. Азгуру пасля вайны.

Тут бюсты-партрэты выдатных дзеячоў сусветнага камуністычнага руху — Мао Цзэ-дуна, Марыса Тарэза, Пальміра Тальяці, Вільгельма Піка, Хо Шы Міна, Кім Ір Сена, Герояў Сацыялістычнай Працы — Е. Ляснічай, Тамары Шкурко, А. Гарэцкай, М. Мялешчанкі, А. Стыкут, партрэты беларускіх пісьменнікаў — Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы; помнік Уладзіміру Ільічу Леніну. Скульптар з неаслабным тэмпераментам і энергіяй адклікаецца на самыя надзённыя грамадска-палітычныя пытанні і задачы.

Значна ўзбагачаецца тэматыка творчасці майстра па сваёй шырыні і зместу задум, яна выходзіць за межы сваёй рэспублікі. З Азгур стварае цыкл партрэтаў майстроў высокіх калгасных ураджаяў, пісьменнікаў, вучоных, дзеячоў савецкай навукі і культуры. Паасобныя творы вызначаюцца дасканаласцю майстэрства і ўваходзяць у лік лепшых дасягненняў савецкай скульптуры. Павышаецца цікавасць мастака да матэрыялу. Многія вобразы атрымалі сваё выяўленне ў граніце, бронзе, мармуры, тэракоце. З. Азгур шукае і знаходзіць у кожным з гэтых матэрыялаў характэрнае і тое спецыфічнае, што ўзмацняе выразнасць вобраза, яго пластычную гранічнасць. Паранейшаму майстар удасканальвае ўмельства выкарыстоўваць у характарыстыцы вобраза кожную дэталь.

Многа сілы ў пасляваенныя гады З. Азгур аддае манументальнай скульптуры. Яго цяга да эпічных рашэнняў у ранейшых работах заканамерна прыводзіць майстра да творчай удачы ў працы над статуяй выдатнага рускага вучонага А. Бутлерава, устаноўленай у адным з пад'ездаў Маскоўскага універсітэта.

Лепшым з многіх манументальных твораў Ф. Рагінская лічыць велічны, строгі па лініях, цэльны ў сваіх пластычных прапорцыях помнік Ул. І. Леніну ў горадзе Арджанікідзе. Аналізуючы іншыя помнікі, Ф. Рагінская прыходзіць да той думкі, што майстэрства скульптара апошніх гадоў больш за ўсё выявілася ў партрэце. З даследчыкам можна поўнасцю згадзіцца, калі мець на ўвазе партрэты Ул. І. Леніна з дзяўчынкай, кітайскага пісьменніка Лу Сіня і адзін з лепшых твораў, які атрымаў станоўчую ацэнку на міжнароднай выстаўцы ў Бруселі, — партрэт Рабіндраната Тагора.

Не ўсё, вядома, раўнацэнна ў вялікай колькасці твораў З. Азгура, нават у лепшых цыклах партрэтаў майстра ёсць недахопы. Аднак сапраўдныя маштабы і месца мастака вызначаюцца тым лепшым, што ім створана. А створанае сапраўды такое значнае, сцвярджае аўтар кнігі, што паставіла З. Азгура ў рад выдатных майстроў савецкага многанацыянальнага мастацтва.

Кніга напісана з дакладным веданнем матэрыялу, дае аб'ектыўную ацэнку творчасці З. Азгура. Яна змяшчае ў сабе найбольш поўна фактычны матэрыял — рэпрадукцыі з работ майстра, пачынаючы з вучнёўскіх і да апошніх гадоў.

Манаграфія, бясспрэчна, з'явіцца значным крокам мастацтвазнаўчай навукі ў распрацоўцы тэмы беларускага выяўленчага мастацтва.

П. ГЕРАСІМОВІЧ.

Ф. С. Рагінская. «Заір Ісакавіч Азгур». Выдавецтва Акадэміі мастацтваў СССР. Масква, 1961.

МАГІЛЁЎСКІ НАРОДНЫ

Сцэна са спектакля «Спатканне ля чаромхі», пастаўленага Магілёўскім народным тэатрам. У ролі Сені — А. Урублеўскі, у ролі Валі — Т. Крукоўская.

Шэрае цемрыва павольна насоўваецца на горад. У змроку тонуць дамы, скверы, паркі. Над вуліцамі, тратуарамі ўспыхваюць тысячы агнёў. Вуліцы становяцца шматлюднымі; здаецца, увесь Магілёў выйшаў вітаць надыход ночы. На жаль, ідзе зіма. Гуляць на холадзе доўга не будзеш. А што ж рабіць? І людзі ідуць у клубы, кінатэатры, дамы культуры. Кожны вечар тысячы людзей праглядаюць новыя кінафільмы (дарэчы, яны дэманструюцца тут раней, чым у Мінску), наведваюць канцэрты калектываў мастацкай самадзейнасці, абласны драматычны тэатр. Ёсць у горадзе і другі тэатр: Народны пры клубе чыгуначнікаў.

Любяць магіляўчане, якія жывуць у чыгуначным раёне, свой Народны тэатр. З вялікай ахвотай наведваюць яго спектаклі. Але не толькі ў сваім клубе выступае калектыў Народнага. Яго спектаклі бачылі рабочыя заводаў штучнага валакна і пад'ёмна-транспартнага абсталявання, саўгаса «Вейна» і фабрыкі імя Валадарскага; студэнты падінстытута. Выязджаюць артысты Народнага ў калгасы і саўгасы, выступаюць на сцэне абласнога драматычнага тэатра. Бачылі іх і мінчане: па тэлевізару і на сцэне Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы; у Палацы прафсаюзаў і ў Тэатры юнага гледача.

Не адразу прыйшло прызнанне. Старэйшая ўдзельніца калектыву інспектар абласной канторы Дзяржаўнага банка Лідзія Агееўна Ходар, якой прысвоена званне артысткі народнага тэатра, расказвае:

— Наш тэатральны калектыў быў створаны даўно. Спачатку мы ставілі невялічкія скетчы, інтэрмедыі, проста дэкламавалі вершы, чыталі ўрыўкі з раманаў, апавяданняў, нарысаў. Выступалі, дзе прыйдзецца, бо не мелі пастаяннага месца. У 1948 годзе быў пабудаваны клуб. З таго часу работа пайшла весялей. Ужо не асобныя людзі прыходзілі ў калектыў, а дзесяткі. Прыйшлося стварыць дзіцячы тэатральны калектыў, тэатральную студыю, канцэртную брыгаду. Рабочыя палюбілі нас. У госці да сябе запрашалі чыгуначнікі іншых гарадоў. З поспехам ішлі нашы спектаклі ў Крычаве, Шклове, Оршы, Быхаве, Рагачове, Асіповічах і іншых гарадах.

Л. Ходар — выканаўца ролі Кацярыны.

Н. Скарабагаты — выканаўца ролі П. Меражкова.

Фато А. Рагоўскага.

— Каля ста чалавек удзельнічае ў нашых тэатральных калектывах, — гаворыць рэжысёр і мастацкі кіраўнік народнага тэатра Уладзімір Змітравіч Бараноўскі. — Усе ўдзельнікі вучацца або працуюць. Ёсць і пенсіянеры, як, напрыклад, З. Яўтуховў, былы майстар вагоннага дэпо, які 45 год працаваў на чыгунцы. Лепшым удзельнікам калектыву прысвоена званне «артыст народнага тэатра». Яго ўдастоены токар паравознага дэпо Я. Лаўрэнцьеў, экспедытар абласнога ўпраўлення хлебапрадуктаў М. Скарабагаты, інжынер Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі А. Скацёнак, былы столяр нашага Дома культуры, а зараз загадчык клуба мясакамбіната А. Урублеўскі і іншыя. Некаторыя нашы таварышы перараслі рамкі самадзейнасці і сталі прафесіянальнымі акцёрамі. Так, М. Мацюшэўскі зараз працуе ў абласным драматычным тэатры; выпускніца тэатральнай студыі Э. Дзераўцова —артыстка Бабруйскага тэатра; намотчыца завода «Электраручнік» Т. Яблыкава вучыцца ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва; В. Тураў—рэжысёр «Беларусьфільма»; С. Аграновіч — кіраўнік танцавальнага калектыву і выкладчык тэатральнай студыі.

Адной з задач, якія партыя вызначае ў новай Праграме КПСС, прынятай гістарычным XXII з'ездам, з'яўляецца усебаковае развіццё чалавечай асобы. У перыяд пераходу да камунізма, — гаворыцца ў Праграме,— узрастаюць магчымасці выхавання новага чалавека, які гарманічна спалучае ў сабе духоўнае багацце, маральную чыстату і фізічную дасканаласць.

Калі гаварыць пра артыстаў Народнага тэатра, то многія гэтыя рысы цяпер уласцівы ім. Не, не для нажывы, не дзеля асабістай выгады амаль увесь свой вольны час праводзяць у клубе планавік чыгуначнага аддзела рабочага забеспячэння С. Валодзькава, сакратар камсамольскай арганізацыі завода «Электраручнік» Л. Арахоўскі, дыспетчар аэрапорта І. Гесь, медыцынскія сёстры Т. Крукоўская, А. Карнілава і інш. Некаторыя з іх з'яўляюцца дружыннікамі, членамі рэдкалегій насценных газет, выконваюць іншыя грамадскія даручэнні. Ёсць і такія, што не толькі выдатна працуюць, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце, але і вучацца.

Гэтыя людзі не лічацца са сваім часам, калі іх любімая работа патрабуе яго. Здараецца, што ўсё вечары сцэна клуба занята іншымі мерапрыемствамі, а іх тут шмат: 20 дзён у месяц у глядзельнай зале дэманструюцца кінафільмы; два-тры дні займаецца універсітэт культуры; пяць дзён — вечары моладзі; і толькі два дні застаецца Народнаму тэатру на паказ спектакляў. А калі ж рэпетыцыі праводзіць?

— Спачатку праводзім іх у кабінеце рэжысёра, — гаворыць А. Скацёнак, — а потым, калі ўжо без сцэны нельга абысціся, выкарыстоўваем яе — калі ў клубе танцы. У фае танцуюць, а мы на сцэне рэпеціруем. Нярэдка працуем і ноччу, пасля кінасеансаў.

Не, не выгады шукаюць у клубе гэтыя цудоўныя, шчырыя людзі, якія выхоўваюць пачуцці прыгожага, добры густ, павышаюць культуру сваю і другіх, кожным сваім спектаклем садзейнічаюць духоўнаму росту чалавека.

Шмат спектакляў паказвае працоўным і дзіцячы калектыў Народнага тэатра.

Вялікую, карысную справу робяць артысты Народнага. Прыгадваецца такі выпадак.

Мы сядзелі ў кабінеце рэжысёра, размаўлялі, калі ў пакой зайшла жанчына год сарака пяці ў рабочай ватоўцы. Яна акінула нас позіркам і адразу падышла да Бараноўскага.

— Дзякую вам, Уладзімір Змітравіч, добрую вы справу робіце.

— Калі ласка, але, прабачце, з кім маю гонар размаўляць?

— Сын мой у вас вучыцца. Да гэтага быў такім неслухам, што нават і ўявіць цяжка. Вучыўся дрэнна, па вуліцы бадзяўся. А я на заводзе працую, рабочая, не маю часу з ім займацца. Цяпер ён зусім іншы. Стаў добрым вучнем, мне дапамагае, пачаў многа чытаць, марыць аб жыцці...

Такіх, як сын гэтай жанчыны, у калектыве многа. Толькі за адно гэта, ужо не гаворачы пра ўсё іншае, можна сказаць артыстам Народнага тэатра: вялікую карысную справу робіце вы, таварышы!

П. ШАЎЦОЎ.

г. Магілёў.

АБ ПАЭЗІІ — ПА ЗАКОНАХ ПАЭЗІІ

Алесь КУЧАР

Са здавальненнем і добрай творчай зайздрасцю прачытаў я новую кнігу крытыка Рыгора Бярозкіна «Спадарожніца часу». Хаця кніга прысвечана творчасці такіх розных паэтаў, як Янка Купала, Міхась Чарот, Максім Лужанін, Пятро Глебка, Змітрок Астапенка, Валянцін Таўлай, Антон Бялевіч, Анатоль Вялюгін, Кастусь Кірэенка, Аляксей Русецкі, Рыгор Барадулін, аднак яна не пакідае ўражання збору артыкулаў аб гэтых паэтах. Кніга Р. Бярозкіна метадалагічна цэласная, творча адзіная, бо цэльны і бескампрамісны сам крытык у сваіх творчых поглядах і ідэалах.

Адзін клопат прасякае ўсю кнігу — клопат аб тым, каб наша савецкая паэзія была на вышыні задач часу, каб глыбокая ідэйнасць спалучалася ў ёй з вялікім майстэрствам.

Аўтарская канцэпцыя ўзаемаадносін паміж рэчаіснасцю і яе мастацкім выражэннем, грунтуючыся на марксісцка-ленінскім фундаменце, мае шмат плённых у творчых адносінах палажэнняў.

Адзін з галоўных і цікавейшых момантаў у гэтай канцэпцыі — думка аб тым, што паэтычная творчасць нараджаецца тады, калі імкненне самой рэчаіснасці ўбачыць свой вобразны адбітак, сваё абагульненне ў мастацкай думцы прыходзіць у раўнавагу з жывой і палкай думкай паэта, якая імкнецца да ўвасаблення ў рэчаіснасць.

«Мастацкі, эстэтычны эфект такой сустрэчы, — гаворыць Р. Бярозкін, — будзе тым больш адчувальным, чым больш істотная і глыбокая ў грамадскім сэнсе тая з'ява жыцця, якая шукае выйсця ў слове, і чым больш непасрэдна шчыльна звязана ўнутраная думка паэта з яго чалавечай натурай».

Прынцыповая важнасць гэтага палажэння ў тым, што яно патрабуе арганічнага адзінства зместу і формы. У святле яго не можа быць ніякай паблажкі паэту, думка якога не саспела для адлюстравання істотнай з'явы рэчаіснасці, але які толькі адгукнуўся на настойлівую патрэбнасць самой рэчаіснасці бачыць свой адбітак у мастацкім слове. Гэтак сама як малая істотнасць грамадскай з'явы нават пры арганічным пранікненні ў яе думкі паэта не дасць вялікіх і плённых творчых вынікаў.

Настойліва дамагаецца крытык таго, каб творчасць паэта стаяла на ўзроўні народнага духу, каб самае асабістае ў лёсе паэта супадала з агульнанародным нават тады, калі гэтае асабістае выступае гранічна індывідуалізавана, інтымна.

Вось чаму, — робіць вывад крытык, — трэба не цурацца лірычнага ўспрыняцця гістарычных падзей. Іменна такое ўспрыняццё мы маем ва ўсім тым лепшым, што далі нам Маякоўскі, Купала, Тычына, Асееў. Не абстрагавацца ад уласнай біяграфіі, бо іменна праз яе, праз асабістае, уласнае, паэтава голас гісторыі ў яго творчасці будзе лепш даходзіць да нас. Вядома, у тым выпадку, калі паэт будзе глядзець на лірыку не як на форму адыходу ад гісторыі, не як на «адпачынак» ад палітыкі, а, наадварот, будзе бачыць у лірыцы своеасаблівую форму ўвасаблення шматграннага духоўнага зместу эпохі.

Давер да свайго ўласнага ўспрыняцця, лірычны голас як выразнік голасу эпохі... Наколькі добра разумее цяпер Р. Бярозкін, якімі неймавернымі творчымі намаганнямі можна заваяваць гэта права гаварыць ад імя эпохі. І правільна ён дакарае за бястактнасць тых паэтаў, якія спрабуюць выставіць сябе на пярэдні план, не маючы на гэта адпаведных падстаў. Бо трэба валодаць такім агнявым тэмпераментам, якім валодаў Маякоўскі, каб верш пра ўсеагульную забастоўку англійскіх рабочых закончыць радкамі: «Пять миллионов — проститe за восторженность — взял бы, обнял и стал целовать».

З усведамленнем гэтага звязана змаганне крытыка супраць вершаў, у якіх няма эмацыянальнага раскрыцця тэмы, вершаў, напісаных без страсці, без гарэння, супраць вобразнай ураўнілаўкі, якая жыццёвы факт пазбаўляе пахаў і колераў рэчаіснасці, надае яму «ідэальны», незямны выгляд.

Гэтай эмацыянальнай ураўнілаўкі не было ў Маякоўскага, «У яго параходы на Адэскім рэйдзе або Эйфелева вежа гаварылі сваімі галасамі», — трапна зазначае Р. Бярозкін.

Крытык правільна заклікае больш давяраць фактам, сур'ёзна іх перадаваць, не зніжаючыся, аднак, да інфармацыйнай сухасці. Не павінна лірыка цурацца элементаў «грубай» прозы, праз якую можа «аб сабе заявіць гісторыя, як штодзённасць, як жывая рэальнасць народных спраў».

Сапраўды, і Куляшоў, і Панчанка, і Броўка выглядалі «празаікамі» побач са сваімі лірычна «расквечанымі» паплечнікамі, настолькі Куляшоў, Панчанка, Броўка большую ўвагу аддавалі дэталям і падрабязнасцям апісальнага характару. Але ў гэтых дэталях і апісаннях больш паэзіі, чым у размаўлівых, лірычных «охах» і «ахах» некаторых лірыкаў.

Чужым з'яўляецца для паэзіі бяздумнае пакалыхванне на хвалях верша, у якім з непатрэбнага сэнсу пейзажы, і цераспалосіца неарганічных (з пункту гледжання жыццёвай праўды) вобразаў, і дзе толькі дамінуе так званая «пяшчотная», уяўна лірычная інтанацыя.

«Кожны мастацкі элемент павінен быць глыбока змястоўным, стаяць на ўзроўні ідэйнай канцэпцыі твора, яе значнасці і навізны», — гаворыць крытык.

Правільна патрабуе ён ад паэта верша як адзінай і нязменнай формы. Падтрымліваючы творы, дзе рака верша змывае нават страфічныя размежаванні, ён слушна заўважае, што праўда перажывання павінна стаць вершам, рытмам, інтанацыяй, паэтычнай рэальнасцю.

І тут аўтар прыходзіць да разумення верша не як апавядання, выкладзенага ў страфічнай, зарыфмаванай форме, а як арганічнай жывой істоты, дзе ўсё важна і значна і дзе рытм, метр, рыфма прадуладны нават найменшай змене думкі паэта. Р. Бярозкін заўважае, што «слова ў паэзіі значна больш набліжана да чалавечага перажывання, чым слова ў прозе».

Вось чаму вялікая прастата патрабуецца ад паэтычнага слова. Але як жа прыйсці да гэтай прастаты?

«Апошняя рэч — гэта прастата, — пісаў Шапэн. — Вычарпаўшы ўсе цяжкасці, перайграўшы агромную колькасць нот, вы бачыце перад сабою прастату, якая ва ўсёй сваёй чароўнасці з'яўляецца апошняй пячаткай мастацтва. Усякі, хто жадае адразу прыйсці да гэтага, нічога добрага не дасягне, нельга пачынаць з канца».

Маючы ясную паэтычную канцэпцыю, Р. Бярозкін, аднак, не ператварае яе ва універсальны ключ, у адмычку, якая падыходзіць да розных паэтычных індывідуальнасцей. Не! З кожным паэтам ён размаўляе паводле законаў, прызнаных над сабой паэтам. Р. Бярозкін не дэкрэтуе і не камандуе, а намагаецца, зыходзячы з гэтых законаў, вылучыць найбольш моцныя бакі яго творчасці, вартыя далейшага развіцця. І тут трэба адзначыць рысу, якая ўсё больш і больш уваходзіць у крытычную практыку Р. Бярозкіна — рысу добразычлівасці.

Першае пытанне, якое цяпер ставіць крытык, гэта пытанне аб тым, што дадатнага ёсць у паэта, якія моцныя бакі яго творчасці. Няхай яны яшчэ не развіліся, не акрэплі, калі гэта, напрыклад, малады паэт. Але крытык бачыць сваю задачу ў тым, каб нязначнае зерне праўды і натхнення, якое сустракаецца ў творы маладога паэта, вылучыць, асвятліць, зрабіць бачным для ўсіх. Ён імкнецца паказаць дарогу далейшага творчага развіцця. Не заўсёды праўда, гэта выходзіць удала ў крытыка. Часамі пад яго пяром творчасць паэта не паўстае перад намі як арганічная цэласнасць, а толькі як сума ўдалых і няўдалых твораў, вершаў, радкоў ды ўсё дадатнае зрэдку зводзіцца да некалькіх дробных вершаваных цытат. Але такія артыкулы сустракаюцца рэдка ў крытычнай практыцы Р. Бярозкіна апошніх год. У пераважнай большасці ў яго артыкулах ускрываюцца заканамернасці развіцця творчасці паэта, выяўляецца яго мастацкая канцэпцыя, трапна асвятляюцца яе моцныя і слабыя бакі. Як мастацкая цэласнасць раскрыта творчасць Максіма Лужаніна, Антона Бялевіча і іншых. Вось як дакладна і скандэнсавана выяўлена істотнае ў творчасці А. Бялевіча:

«Таленавітая творчасць Антона Бялевіча мае супярэчлівы характар. З аднаго боку яркія, але не апладнёныя вялікай ідэяй бытавыя і пейзажныя замалёўкі, а з другога — «ідэі», якія не сцвярджаюць усяго багацця рэальнага свету».

Зусім правільна крытык падкрэслівае, што, вызваленая ад інтэлектуальнага элемента, робіцца кніжная сама натуральнасць Бялевіча, яго «прывязанасць да зямлі».

Але гэтыя сапраўды глыбокія і цяжкія для свайго вырашэння супярэчнасці ў творчасці А. Бялевіча не перашкаджаюць крытыку бачыць моцныя бакі яго паэзіі.

Тое, што крытык не навязвае паэту рэцэптаў, чужых яго творчай індывідуальнасці, хаця нярэдка спасылаецца на іншых паэ-

Рыгор Бярозкін. «Спадарожніца часу». Артыкулы аб паэзіі. Дзяржаўнае выдавецтва БСС

ПЯСНЯР «ПОМСТЫ І СМУТКУ»

ДА 140-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. А. НЯКРАСАВА



Я лиру посвятил народу
своему.
Быть может, я умру неведомый
ему,
Но я ему служил — и сердцем
я спокоен...
Пускай наносит вред врагу
не каждый воин,
Но каждый в бой иди!

У гэтых словах вялікага рускага паэта коратка, але вельмі выразна акрэслена галоўная мэта ўсёй яго творчасці. Праўда, Някрасаў з уласцівай яму выключнай сціпласцю ў значнай меры недаацэньвае тут тую важную ролю, якую ён разам са сваімі сатрэнікамі Чарнышэўскім і Дабралюбавым адыграў у рускім вызваленчым руху. На самай справе ў напружанай палітычнай і ідэйнай барацьбе 40—70-х гадоў мінулага стагоддзя яго паэзія ў яркіх мастацкіх вобразах адлюстравала жыццё, барацьбу і спадзяванні заняволенага рускага народа, яго мары і імкненні.

Творчасць Мікалая Аляксеевіча Някрасава складае не толькі цэлую эпоху ў гісторыі рускай літаратуры і паэзіі, але з'яўляецца і каштоўнейшым укладам у гісторыю рускай грамадскай думкі і рэвалюцыйнага, вызваленчага руху. Ён належыць да ліку тых выдатных дзеячоў рускай культуры, якія пракладвалі новыя шляхі ў літаратуры і ў сваёй творчасці імкнуліся да вырашэння важнейшых пытанняў грамадскага жыцця свайго часу. Сваімі творамі ён хацеў дапамагчы сацыяльнай перабудове грамадства ў адпаведнасці з перадавымі, рэвалюцыйна-дэмакратычнымі ідэямі эпохі. Таму яго ўплыў на сучаснікаў, асабліва на моладзь, быў вельмі вялікім. Гэта прызнавалі і ідэйныя ворагі паэта. Так, напрыклад, агенты трэцяга аддзялення, якія забаранялі многія вершы і цэлыя кнігі Някрасава, вымушаны былі прызнаць, што «Някрасаў... зрабіўся ў цяперашні час любімым паэтам рускай моладзі». А літаратурны даносчык Фадзей Булгарын дакладваў сваім шэфам: «Някрасаў — самы адчайны камуніст: варта толькі прачытаць яго вершы і прозу ў С.-Пецярбургскім Альманаху, каб пераканацца ў гэтым. Ён страшэнна агітуе за рэвалюцыю».

Аб тым, што рэвалюцыйныя матывы ў творчасці Някрасава з кожным годам узмацняліся, сведчаць яго ўпартыя намаганні стварыць вобраз станоўчага героя-рэвалюцыянера. Калі ў вершах пачатку 40—50-х гадоў паэт паказваў сваю музу мужнай пакутніцай, якая маўкліва пераносіць усе болі, то ўжо ў другой палове 50-х гадоў Някрасаў у вершы «Паэт і грамадзянін» адкрыта заклікае «громить пороки смело».

У 1856 годзе Някрасаў піша першую паэму аб рэвалюцыянерах «Няшчасныя», якая прысвечана праслаўленню людзей, што змагаліся і пакутвалі за народную справу. У цэнтры паэмы — вобраз рэвалюцыянера Крота.

Асабліва вялікае значэнне для рэвалюцыйнай моладзі 60-х гадоў мела някрасаўская «Песня Яромушкі», многія радкі з якой сталі рэвалюцыйнымі лозунгамі. Тут паэт малюе вобраз прапагандыста ў вёсцы і яго вуснамі гаворыць аб сродках барацьбы за братэрства, роўнасць і свабоду народа.

Часта правобразамі станоўчых герояў Някрасава з'яўляліся яго сябры і саратнікі. Так, вялікі дэмакрат Чарнышэўскі ўвасоблен у паэзіі Някрасава ў вобразе прарока рэвалюцыі, які лічыць немагчымым «служить добру, не жертвуя собой». У вершы «На смерць Шаўчэнкі» апяваецца жыццё вялікага ўкраінскага змагара і паэта прыгнечанага украінскага сялянства, якога замучыў царскі ўрад. М. А. Дабралюбаву паэт прысвяціў два вершы: «Дваццатае лістапада» і «Памяці Дабралюбава». Рысы характару Дабралюбава таксама добра відаць у адным з лепшых вобразаў рэвалюцыянераў, створаных Някрасавым у паэме «Каму на Русі жыць добра» — у вобразе Грышы Дабрасклонава, якому як і Дабралюбаву, «лёс рыхтаваў шлях слаўны, імя гучнае, сухоты і Сібір». Грыша лічыць сябе самым шчаслівым чалавекам у Расіі, бо ўсё жыццё аддае справе барацьбы за тое, каб кожнаму селяніну жылося прыволька-весела. Някрасаў не сумняваўся, што сялянскія «тапары ляжаць — да пары». Гэта і натхніла яго на стварэнне геніяльнай песні «Русь».

Рать подымается —
Неисчислимая!
Сила в ней скажется
Несокрушимая!
Ты и убогая
Ты и обильная,
Ты и забитая,
Ты и всесильная,
Матушка-Русь!..

Думы аб Расіі, аб рускім народзе і яго далейшым лёсе праходзяць праз усе творы Някрасава: ён быў вялікім патрыётам і пісаў свае вершы крывёю сэрца. Але паэт быў далёкі ад нацыянальнай абмежаванасці. Яго цікавіў таксама лёс іншых народаў Расіі. Так, напрыклад, Някрасаў, як і іншыя перадавыя рускія пісьменнікі, часта звяртаў сваю ўвагу да беларускага народа, які знаходзіўся ў яшчэ больш цяжкіх умовах, чым рускі народ. Менавіта, ён стварыў у сваім неўміручым творы «Чыгунка» ўпершыню ў рускай літаратуры рэалістычны вобраз беларуса. Гэты вобраз узяты паэтам з гушчы жыцця прыгнечанай царызмам Беларусі.

Прагрэсіўныя дзеячы беларускай культуры пільна сачылі за творчасцю М. А. Някрасава, лічылі яго сваім ідэйным настаўнікам, захапляліся яго паэзіяй. Царскае самадзяржаўе, якое добра ведала рэвалюцыйны ўплыў вершаў паэта, любым чынам імкнулася ізаляваць яго ад беларускіх чытачоў. Так, пасля таго, як было падаўлена польскае паўстанне 1863 года і па ўсёй Расіі часова перамагла рэакцыя, царскі ўрад забараніў прывозіць у Беларусь і распаўсюджваць тут творы Някрасава.

Але як ні стараліся царскія халуі засцерагчы Беларусь ад пранікнення рэвалюцыйнай рускай літаратуры, ім не ўдалося ажыццявіць свае намеры. Перадавыя прадстаўнікі беларускага народа — Францішак Багушэвіч, Янка Лучына, Адам Гурыновіч і іншыя — выхоўваліся на вялікіх традыцыях рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі. Газета «Минский листок», якая выходзіла ў 1886—1894 гадах, вельмі часта і з любоўю ўспамінала імя Някрасава. Вершы і некаторыя апавяданні, змешчаныя ў газеце, пераканаўча сведчаць аб плённым уплыве вялікага рускага паэта на творчасць тагачасных беларускіх пісьменнікаў. Асабліва прыкметна праяўляецца гэты ўплыў пры вырашэнні тэмы горкага сялянскага жыцця. Так, у апавяданні Знаёмца «Не сышлися характарам» успамінаецца не толькі імя Някрасава, але і прыводзяцца някрасаўскія вобразы з паэмы «Каму на Русі жыць добра».

У плане яўнага наследавання Някрасаву напісаны верш Мік. Зялінскага «Голад», эпіграфам да якога ўзяты радкі з някрасаўскай «Чыгункі»: «В мире есть царь: этот царь беспощаден, голод названье ему».

Някрасаўскія традыцыі ў паказе сялянскага жыцця ва ўмовах паслярэформеннага перыяду наследаваў і развіваў у беларускай літаратуры Ф. Багушэвіч. Пры гэтым беларускі паэт не механічна капіруе Някрасава, а па-наватарску развівае някрасаўскі матыў «помсты і смутку» ў такіх сапраўды патрыятычных і рэвалюцыйна-дэмакратычных вершах, як «Бог не роўна дзеле», «Дурны мужык, як варона». «Кепска будзе!», «Гора», «Не цурайся!» і інш.

Значнае ідэйнае і мастацкае ўздзеянне аказаў Някрасаў на дарэвалюцыйную творчасць такіх буйных беларускіх пісьменнікаў, як Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны.

У 1921 годзе Н. К. Крупская, якая пры гэтым мела на ўвазе і адносіны да паэта Ул. І. Леніна, сказала пра М. А. Някрасава: «Гэта наш паэт, хоць і аддзяляюць нас ад яго тры рэвалюцыі, якія не пакінулі каменя на камені ад старых парадкаў».

На ўсе пытанні аб свабодзе і шчасці нашага народа, якія так пакутліва імкнуўся вырашыць паэт, адказала Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя, наша эпоха будаўніцтва камунізма, якая перавысіла самыя высокія мары лепшых людзей мінулага.

Б. КЛЮСАЎ.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Першы пераклад верша М. Някрасава «Мароз» на беларускую мову быў зроблены ў другой палове XIX стагоддзя Адамам Гурыновічам.

У 1905—1908 гадах Янка Купала пера ладаў вершы М. Някрасава «Галадоўліца», «Соленая», «Што ні год, памяншаюцца сілы», «У людзей і ў нас», «Агароднік», «Няжатыя гоні».

Над перакладам паэтычных твораў М. Някрасава многа працаваў Алесь Якімовіч: «Каму на Русі жыць добра» (1940, 1948), «Генерал Таптыгін» (1940, 1952), «Дзядуля Мазай і зайцы» (1936, 1938, 1957), «Сялянскія дзеці» (1938, 1955). Усяго выдадзена дзевяць кніг М. Някрасава, перакладзеных А. Якімовічам, у колькасці каля 200 тысяч экземпляраў.

Творы М. Някрасава перакладалі народны пісьменнік Кандрат Крапіва («Забытая вёска»), Алесь Гурло («Радзіма»), Уладзімір Шахавец («Рускаму пісьменніку»), Міхась Клімковіч («Свабода»), Кастусь Кірэенка («Няжатая палоска» і «Зялёны шум») і іншыя.

Нядаўна Мінск наведала дэлегацыя Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы. Госці пазнаёміліся з беларускай сталіцай, пабывалі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны і Мастацкім музеі, на трактарным і гадзіннікавым заводах.

На гадзіннікавым заводзе быў праведзен вечар балгара-савецкай дружбы. Як самых лепшых і дарагіх гасцей сустрэлі работніцы завода дэлегацыю камітэта. Вечар прайшоў надзвычай цёпла, сардэчна.

Незабыўнай была гэтая сустрэча. Старшыня Варненскага камітэта балгара-савецкай дружбы Валя Вічава (справа) расказала аб жыцці і працы свайго народа.

Вечар балгара-савецкай дружбы закончыўся вялікім канцэртам, у якім выступілі ўдзельніцы мастацкай самадзейнасці гадзіннікавага завода.

Фота В. Бараноўскага.

ПАРТРЭТНАЯ ГАЛЕРЭЯ

У Смаргоні ў скверыку каля Дома культуры ўстаноўлена партрэтная галерэя перамožцаў сацыялістычнага спаборніцтва за достойную сустрэчу XXII партыйнага з'езда.

Сярод перадавых людзей — партрэты брыгадзіра механізатараў калгаса «Чырвоны партызан» П. Ліса, перадавых даярак рвёна Я. Лішак (калгас «Светлы шлях») і С. Гіль (саўгас «Дубраўляны»), кінамеханіка Залескага сельскага Дома культуры М. Савоські і інш.

Усе гэтыя партрэты напісаны мясцовым самадзейным мастаком Аляксандрам Іванавічам Жывае-вым.

Ул. СУРМАЧ.

Міжнародны кінаальманах

На гарадскіх і сельскіх экранах Беларусі дэманструецца першы нумар міжнароднага кінаальманаха Сусветнага Савета Міру «Дзень маладога чалавека».

Фільм складаецца з шасці самастойных навел: балгарскай, венгерскай, нямецкай (ГДР), кубінскай, японскай, савецкай, знятых кінематаграфістамі гэтых краін.

Аб'яднаныя дыктарскім тэкстам, навелы разам з пралогам складаюць цэласны фільм, прысвечаны агульнай ідэі — у барацьбе за мір моладзь павінна шчыльней згуртаваць свае рады.

Мантаж кінакарціны ажыццёўлены рэжысёрам Ю. Озеравым на кінастудыі «Масфільм». Дыктарскі тэкст напісан драматургам Г. Мдзівані.

У ГВІНЕІ

З далёкіх падарожжаў

Віталій ВОЛЬСКІ

ЛЕАПАРД І БАБУІНЫ

Змяніліся адносіны і да леапарда. Раней яго лічылі шкодным драпежнікам і знішчалі ўсюды, дзе толькі маглі, усімі спосабамі і без усякіх абмежаванняў. Леапард зрабіўся ў Афрыцы рэдкім зверам. Затое дзікія свінні і гвінейскія бабуіны, малпы з сямейства павіяноў, настолькі размножыліся, што сельскае насельніцтва пачало цярпець ад іх з кожным годам усё большыя страты.

— Дзікі руйнуюць палеткі ноччу, а бабуіны і днём, — гаворыць Анры. —Разумныя, злыя і адважныя, гэтыя малпы з сабачымі галовамі не баяцца сонечнага святла. Яны з'яўляюцца цэлымі полчышчамі, накідваюцца на сады, палі і агароды, набіраюць здабычы, колькі могуць і спрытна ўцякаюць. На змену адной бандзе з'яўляецца другая.

Вы не можаце сабе ўявіць, што тады робіцца! Мужчыны крычаць і страляюць, дзеці кідаюць камені, жанчыны плачуць і праклінаюць нахабных разбойнікаў. Толькі бабуіны не звяртаюць на гэта ніякай увагі, робяць сваю шкодную справу.

Калі хто-небудзь з налётчыкаў і застанецца забіты, такой бяды! Іншых гэта быццам і не датычыцца, — занадта іх многа. У кожнай бандзе да двухсот бабуінаў, а часам і больш. Кожны дарослы бандыт можа пацягнуць за адзін раз пяць-шэсць бананаў ці пачаткаў кукурузы. Пасля такога налёту на полі ці плантацыі мала чаго застаецца.

Тым не менш, нягледзячы на вялікую шкоду і страты, чорныя людзі і не думаюць знішчаць бабуінаў. Большасць гвінейцаў лічыць, што малпу забіваць нельга. У некаторых вёсках жанчыны нават самі прыносяць у кошыках на ўскраіну лесу пачастункі для бабуінаў, каб тыя не руйнавалі праз меру палеткі.

Зацятую барацьбу супраць бабуінаў вядуць толькі белыя пасяленцы, але з хітрымі малпамі нічога і не зробіш. Нікога яны не баяцца, дзейнічаюць дружна і арганізавана, нібы па загадзя распрацаванаму плану. Іх не адагнаць ні стрэламі, ні шумам, ні агнём, ні сабакамі, ні пасткамі. Яны ўцякаюць, прыўзняўшы хвасты, на бяспечную адлегласць, спакойна глядзяць на ўсхваляваных людзей, ядуць захопленую здабычу і часам брэшуць, як сабакі. Бабуіны добра ведаюць, на якой адлегласці можа ў іх трапіць куля. Іх не ашукаеш ніякай пасткай.

У багатых сядзібах скрозь агароджы вакол садоў і плантацый прапушчаны электрычны ток. Але ж і гэта не дапамагае. Бабуіны хутка распазналі, што дакранацца да дроту нельга, і заўсёды знаходзяць спосаб прабрацца туды, куды ім трэба, без шкоды для сябе. Яны баяцца толькі леапарда на зямлі і кракадзіла ў вадзе.

Здараецца часам, што бабуіны забіраюцца нават і ў пуні. Як вопытныя злодзеі, яны выстаўляюць вартавых, якія брэхам папярэджваюць астатніх аб небяспецы.

Няма ратунку ад гэтых нахабных разбойнікаў з галовамі, падобнымі на сабачыя.

Вось тут людзі і ўспамянулі леапарда, хоць і позна, але добрым словам. Пачалі скардзіцца і шкадаваць, што так мала леапардаў засталося на свеце, бо толькі леапард і зможа ім дапамагчы супраць нахабных малпаў.

Справа ў тым, што леапарды кормяцца ў асноўным маладымі дзікамі і бабуінамі. Людзі зразумелі, што чым менш леапардаў у лесе, тым больш дзікаў і бабуінаў на вясковых палетках. Таму цяпер і леапард узяты ў Гвінеі пад абарону, каб аднавіць у прыродзе неразумна парушаную раўнавагу.

БАНАНАВЫ ГАЙ

Машына спынілася каля вялікага бананавага гаю.

Мы ідзём па вузкай сцежцы.

Сярод вялізных, заўсёды падранных лістоў з усіх бакоў вісяць над намі і вакол нас цяжкія, важкія гронкі жоўта-зялёных пладоў.

Клапатлівы Анры зноў папярэдзіў нас, каб мы ўважліва глядзелі пад ногі.

— Змеі? — пытаемся мы крыху іранічна.

— Так, месье, — сур'ёзна пацвердзіў праваднік. — Будзьце асцярожны!

Жартаваць на гэтую тэму Анры яўна не хоча. У голасе яго чуецца нават некаторая занепакоенасць. Ён гаворыць з намі тонам школьнага настаўніка, які звяртаецца да свавольных і лёгкадумных вучняў:

— Сярод лісця бананаў часта хаваецца змяя, сама з выгляду падобная на плод банана. І таўшчынёй яна з банан, і скура ў яе зялёнага колеру. Называюць яе — «мамба». Гэта вельмі палахлівая і вельмі небяспечная змяя. Ад укуса зялёнай «мамбы» чалавек можа памерці праз некалькі мінут. Зборшчыкі бананаў уважліва сочаць, каб незнарок не ўхапіць разам з гронкаю бананаў і бананавую змяю.

Мы дзякуем Анры за папярэджанне і ідзём далей. Тут растуць адны бананы, і растуць яны вельмі густа.

Гэта сапраўды вялікі... я ледзь не сказаў — лес, але тут жа падумаў, ці правільна гэта будзе?

Адны называюць участак, дзе мы знаходзімся, бананавым гаем, другія — лесам, а трэція — плантацыяй. Апошняя назва здаецца найбольш правільнай, бо тут растуць не дзікія, а культурныя бананы, пасаджаныя і вырашчаныя чалавекам.

Апроч таго, банан зусім не дрэва, як гэта многім здаецца, а трава.

Так, хоць банан з выгляду і падобны на дрэва, але ў сапраўднасці з'яўляецца, па ўсіх правілах батанікі, «шматгадовай трававіднай раслінай з тоўстым карнявішчам».

Вось што такое банан, калі разбірацца сур'ёзна. Таму мы і будзем лепш называць бананавы гай плантацыяй.

Першапачатковай радзімай банана лічыцца Паўднёва-Заходняя Азія, але цяпер ён распаўсюджаны па ўсіх трапічных краінах свету. У Афрыцы банан, як культурная расліна, быў вядомы з далёкіх старажытных часоў, задоўга да з'яўлення еўрапейцаў. Ім карысталіся яшчэ за пару тысячагоддзяў да нашай эры егіпцяне. Партугальцы, якія першымі трапілі ў Заходнюю Афрыку, пісалі пра банан як пра адну з асноўных культурных раслін афрыканскага насельніцтва.

На плантацыі, па якой мы ідзём, бананы растуць шчыльнымі радамі, адзін каля аднаго, з невялікімі прамежкамі. На адзін гектар зямлі тут прыходзіцца каля дзвюх тысяч раслін.

Вялізныя лісты банана, у трычатыры метры даўжынёй, так звязаны і сплецены ў сваёй аснове між сабою, што ўтвараюць нейкае падабенства ствала, вышынёю да дзесяці метраў.

Размнажаюцца культурныя бананы адросткамі, якія з'яўляюцца кожны год на карнявішчы расліны. На старым ствале пакідаюць адзін адростак, а іншыя садзяць на новым участку. Малады банан дае ўраджай праз паўтара гады пасля таго, як з'явіліся новыя лісты. Кожная расліна дае адну гронку вагою ў дванаццаць-пятнаццаць кілаграмаў.

Мучністы банан, плады якога не такія салодкія, займае, нароўні з рысам, вельмі значнае месца ў харчаванні ўсяго насельніцтва Заходняй Афрыкі. Яго ядуць і вараным, і смажаным, як у нас картофлю.

Фруктовы банан, больш салодкі і араматны, ідзе галоўным чынам на экспарт. Вываз бананаў з Гвінеі дасягае звыш пяцідзесяці-шасцідзесяці тысяч тон у год.

Яшчэ нядаўна я бачыў гвінейскія бананы толькі ў магазінах Мінска, цяпер я сустрэўся з імі ў натуральным стане, на іх радзіме.

На плантацыі працуе некалькі дзяўчат, голых да пояса. Яны кінулі свае вялікія гарбузовыя міскі і паглядаюць на нас з цікавасцю.

Адна з дзяўчат, у шырокай каляровай спадніцы і светлажоўтай хустцы, накручанай на галаву, згадзілася, каб яе сфатаграфавалі. І вось яна стаіць каля гронкі бананаў перад чужымі людзьмі знешне спакойна, хоць і яе зусім упэўнена, можа нават крыху спалохана. Чорная, нібы атласная скура ільсніцца на сонцы. Даўгая гнуткая рука з натуральнай грацыяй упіраецца ў бок, другая апушчана ўніз. На шы— чырвоныя каралі, каля ног пустая міска, якая неўзабаве будзе запоўнена зрэзанымі бананамі.

ДЗЕЦІ

Наш прыезд у вёску выклікаў ажыўленне.

Вясёлыя, гаманлівыя дзеці збяліся з усіх бакоў паглядзець на белых чужаземцаў. Некаторыя з дзяцей былі зусім голыя. На маленькіх дзяўчынках былі толькі пацеркі і каляровыя бранзалеты з бісеру. На другіх—даволі прыгожыя плацці. Многія з дзяўчынак прадавалі на базары апельсіны і розныя дробныя рэчы. Двое хлапчукоў былі ў падраных кашулях і сініх берэтах.

З малымі на руках падышлі жанчыны. Яны здзіўлялі нас сваімі надзвычай даўгімі, адвіслымі ледзь не да пояса грудзьмі.

Толькі некаторыя з жанчын, пераважна маладзейшыя, былі апрануты ў лёгкія паркалёвыя плацці з яркай афарбоўкай. Пераважалі сіні, жоўты і чырвоны колер.

Я зняў групу дзяцей.

Яны трымаліся спакойна і сур'ёзна.

Даве дзяўчынкі стаялі зусім як дарослыя, з міскамі на галовах. Хлапчук у сінім берэце трымаў у руках кніжку на французскай мове з відамі Масквы. Гэтую кніжку мы яму падарылі, і ён з цікавасцю разглядаў каляровыя малюнкі.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

У многіх выстаўках удзельнічаў самадзейны гродзенскі скульптар машыніст электрастанцыі А. Ліпень. Народны ўмелец стварыў скульптурныя партрэты Кастуся Каліноўскага, героя Парыжскай камуны генерала Валерыя Урублеўскага.

На здымку вы бачыце скульптара за работай над бюстам беларускай паэтэсы Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

таў, яскрава відаць з таго ж артыкула «Талент і светапогляд» аб творчасці А. Бялевіча.

Разглядаючы паэму «Родная крыніца», каб больш зразумелай зрабіць для паэта сваю думку, Р. Бярозкін прапануе ўявіць, што было б, каб паэма «Сцяг брыгады», блізкая па творчай манеры Бялевічу, была працягам «У зялёнай дуброве», каб Хрысціна, Іван і Васіль з баянам выносілі баявы сцяг, пры чым кожны з хлопцаў стараўся праявіць адвагу не таму, што гэтага патрабуе справа, а з адзінай мэтай прывабіць дзяўчыну».

Вычарпальна выкрывае слабасці творчасці Бялевіча і спасылка на другога блізкага яму паэта — А. Твардоўскага. Не заняў бы прыкметнага месца ў літаратуры А. Твардоўскі, каб увесь свой творчы век пратаптаўся вакол старэнькай бацькоўскай кузні на Смаленшчыне, а не браў яе толькі як трамплін, каб перакінуцца да ўсесаюзнай кузні — да Урала і далей да ўсіх неабсяжных прасторaў краіны.

Хоць з'едлівая, але правільная заўвага Р. Бярозкіна аб тым, што раней раку паэзіі А. Вялюгіна «каламуцілі сцюдзёныя вятры рыторыкі, а цяпер часамі скоўвае лядок халаднаватага «артыстызму». Правільным і арганічным у дачыненні да творчасці К. Кірэенкі з'яўляецца меркаванне, што не абысціся яму без «ціхага пастскрыптума інтымнасці, цеплыні, нявыдуманых чалавечых пачуццяў».

Нават тады, калі Бярозкін адмаўляе пэўны твор і горача спрачаецца з аўтарам, ён не абміне падкрэсліць тое добрае, што ёсць цяпер ці што было раней уласціва паэту. Разважаючы пра паэму А. Русецкага «Другі пачатак», ён не забыўся ўспомніць такія цудоўныя радкі паэта:

Месяц — важкая куля,
пудоў сто, падзі ў ёй,
груз для цэлага каравана,
а не падае вось,
плыве над зямлёй,
як пушынка ад губ каханай.

Мне вельмі блізкая і зразумелая тая размова аб паэтычным майстэрстве, якую вядзе Бярозкін на працягу ўсёй сваёй кнігі. Гэтыя старонкі не вылучаны ў асобны раздзел, гэтак сама як і не зведзены да двух-трох радкоў, якія механічна дадаюцца да сацыяльнага аналізу. Не! Гэтым арганічна дыхае ўся кніга. І размова аб майстэрстве пачынае весціся і вядзецца сур'ёзна толькі тады, калі гэтага вымагае сам змест твора. І вось яскравы прыклад з артыкула пра паэзію Рыгора Барадуліна.

Працытаваўшы радкі паэта пра жніво:

Трасянуў сваім чубам —
даспелым калоссем,
Падперазаўся вязьмом — і ў абоз!
Асмужаны, вусам асцістым
калоўся
І шлях па іржышчу прамяў
снапавоз, —

крытык зазначае: «Уражанне такое, — з бярэцца яно ад цэласнасці і паўнаты аўтарскага пачуцця, — быццам само жніво зарыфмавала сябе, падкрэсліўшы найбольш характэрнае ў сваім аблічча».

І далей пачынаецца вельмі сталая і натхнёная размова аб рыфме ў народных песнях. Крытык піша:

«Глыбока памыляюцца тыя, хто, жадаючы апраўдаць бедную, зацяганую рыфму ў вершах таго ці іншага паэта, атэстуюць яе як рыфму «па-народнаму простую». Не такая ўжо і «простая» рыфма «ласкавая — палясківала» ў шырока-вядомай «Лявоніхе»! А такіх сугуччаў — комплексных, «слыхавых» — у фальклоры вельмі і вельмі багата».

І далей:

«Ці знойдзецца хоць адзін чалавек, больш або менш чулы да паэзіі, якога б не праняла да душы вось гэтая старая, складзеная ў часы прыгону беларуская народная песня:

Я табун сцерагу, а ўсе людзі
спяць,
Я адзін на расе, абмакраў,
акалеў,
Адубеў, перамёрз, ой...

Не, што ні кажы, — дадае крытык, — а выдатны паэт быў той невядомы вясковы хлопец пры табуне! Перажыванні вельмі значныя, інтуіцыя амаль геніяльная, падказалі яму разгарнуць ланцужок сінонімаў: абмакраў, акалеў, адубеў, перамёрз, каб нечакана і на самай высокай ноце рэзка яго абарваць стогнам пякучага болю...»

І нідзе развагі Р. Бярозкіна аб фармальных асаблівасцях верша не ператвараюцца ў нудны пералік памераў, жаночых і мужчынскіх рыфмаў.

«Пытанне аб рыфме, — слушна гаворыць крытык, — пытанне прыватнае, можа нават другараднае. Гэта размова мае на ўвазе перш за ўсё паўнату і багацце жыццёвага зместу, актыўнасць светаадчування, якія ніколі не задавальняюцца формай бязладнай, расхлябанай, млявай, бо знаюць сапраўдную цану слову важкаму, выбранаму беспамылкова сярод многіх слоў».

Маючы на ўвазе паўнату і багацце жыццёвага зместу, а не фармалістычную гульню, Р. Бярозкін бязлітасна крытыкуе асобныя вершы Р. Барадуліна, «не прасветленыя напружанай лірычнай думкай», дзе кожная дэталь існуе сама па сабе, па-за сувяззю з цэлым.

Толькі сапраўдная сталасць, якая абапіраецца на веданне жыцця, абумовіла правільнае прачытанне верша Р. Барадуліна «Соль», у якім шмат выклікана асацыяцый, зроблена шмат экскурсаў для апраўдання слоў: «Ты не перасалі, сынок». З прычыны гэтага верша з прытоеным гневам і горыччу піша крытык:

«І дзеля гэтага каламбура, дарэчы, вельмі няяскага па сэнсу... паэту трэба было турбаваць прадзеда, чумакоў і нават млечны шлях, празваны чумацкім?»

Не магу не пахваліць густ крытыка, які амаль нідзе не памыляецца ў эстэтычнай ацэнцы верша, страфы, радка. А якая гэта рэдкая з'ява ў нашай крытыцы. Як часта чытаеш узнёслы і напышлівы каментарый да радкоў паэта, такіх жа пустых і напышлівых, і з горыччу думаеш: каго хоча ашукаць крытык? У Р. Бярозкіна не гэтак. Ён дае мажлівасць вам самому ацаніць хараство таго, што хваліць.

Вось у Лужаніна:

Жахне ў вочы кур'ерскі, гарачы,
як чутка,
І раскроіць зялёным хвастом
краявід.
Бліскавіцаю шкла
прамільгне заклапочаны хуткі,
Пратуркоча паштовы,
Прасыпле вясёлы транзіт.

І каментарый крытыка:

«Тое, што ў страфе ўжыта мноства дзеясловаў... надае малюнку вялікую дынамічнасць. Звяртаюць на сябе ўвагу трапнасць і навізна «галубінага» слоўца пратуркоча, дастасаванага да паштовага (іменна да паштовага!) цягніка. Гэта ўжо ўсвядомленае майстэрства!»

Або вось як трапна ацэньвае Р. Бярозкін верш іншага паэта — А. Вялюгіна:

«Калі мы чытаем у вершы «Вечны каляндар» такія радкі пра восень:

Хмурыні — й тыя ў тарпах,
І так у полі пуста,
І верас вераснем прапах,
Зазімкамі — капуста, —

дык нам здаецца, што мы гэту восень не проста бачым, але яшчэ і спрабуем «на смак», — так добра перададзена ў чатырохрадкоўі і ломкасць капуснага ліста, і яго халаднаватая свежасць, і ясная сінява першага восеньскага зазімку».

Надзвычай свежае ўспрыняцце паэтам навакольнага знайшло чулага крытыка, які адразу заўважыў гэта. Гэтак сама, як ён заўважыў постаць дзяўчыны з верша К. Кірэенкі, якая, шчаслівая ад кахання, вяртаецца дадому:

Што скажу матулі я,
Як часінай позняю
Я з'яўлюся перад ёй —
Ласкавай і грозная?
Што скажу, схаваю як
Водар той дубровы?
Я ж у хату прынясла
Пах чабаровы...

Смешна, вядома, было б лічыць, што ў такой вялікай кніжцы, як «Спадарожніца часу», няма агрэхаў, недакладна выказаных думак, слабейшых артыкулаў.

Менш цікавымі мне здаліся артыкулы аб «Безказоўным» Янкі Купалы, аб творчасці В. Таўлая. Вузка зразумеў крытык сэнс верша Янкі Купалы «Я не паэта», яўна збіўся ён з добрага тропу ў сваіх глыбакадумных разважах аб сэнсе рыфмы «бацькі — бацькавых» у вершы Р. Барадуліна. Але ўсе гэтыя хібы выразна відаць іменна на фоне добрай кнігі, якая сама дыктуе высокі ўзровень патрабавальнасці. Размова аб паэзіі, якая вядзецца Бярозкіным, настолькі змястоўная, цікавая, напружаная і дасціпная, што як толькі ў яе ўрываюцца некалькі фальшывых радкоў ці павярхоўная думка, яны адразу як на далоні відаць.

Пажадаем таленавітаму крытыку новых творчых поспехаў.

Пачатак гл. у газеце за 1 і 5 снежня г.г.

АМАТАРСКІМ ФІЛЬМАМ — ШЫРОКУЮ ДАРОГУ

У Мінску адбыўся другі рэспубліканскі агляд аматарскіх кінафільмаў, у якім удзельнічала 13 самадзейных кінастудый прафсаюзаў, устаноў Міністэрства культуры і іншых арганізацый рэспублікі. На аглядзе былі паказаны 23 кінафільмы.

За час падрыхтоўкі і правядзення агляду самадзейныя кінастудыі дамагліся павышэння ідэйнага ўзроўню і творчага напрамку ў стварэнні аматарскіх кінатвораў. Фонд аматарскіх фільмаў папоўнены новымі работамі, якія адлюстроўваюць поспехі нашага народа ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Большасць фільмаў, падрыхтаваных аматарамі, прысвечана працы і жыццю вытворчых калектываў, барацьбе за тэхнічны прагрэс, паказу брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы, быту і адпачынку працоўных. Асобныя фільмы аматарскіх кінастудый рэкамендаваны для паказу на экранах рэспублікі.

Разам з тым, вынікі агляду паказалі, што ў развіцці самадзейнага кінамастацтва ў рэспубліцы ёсць сур'ёзныя недахопы.

Абласныя ўпраўленні культуры, гарадскія і раённыя аддзелы культуры, дамы народнай творчасці, абласныя саветы прафсаюзаў, фабрычна-заводскія, мясцовыя камітэты і культасветустановы мала аддаюць увагі развіццю ў нас кінаматарства, слаба вядуць арганізатарскую работу па стварэнню новых аматарскіх кінагурткоў і самадзейных студый, не забяспечваюць кінааматараў апаратурай і кінаматэрыяламі, не аказваюць дапамогі кінаматарам у арганізацыі лабараторнай апрацоўкі знятых матэрыялаў.

Кінааматарскім аб'яднанням недастаткова аказваецца творчая і тэхнічная дапамога з боку кінастудый і прафесіянальных работнікаў кіно.

Асабліва марудна развіваецца кінааматарства ў Гомельскай, Віцебскай і Мінскай абласцях (выключаючы Мінск). З гэтых абласцей на рэспубліканскі агляд не было прадстаўлена ніводнага аматарскага кінафільма.

Калегія Міністэрства культуры БССР і прэзідыум Беларускага савета прафсаюзаў прынялі спецыяльную пастанову па выніках другога рэспубліканскага агляду аматарскіх фільмаў.

Гэтая пастанова абавязвае абласныя ўпраўленні культуры, дамы народнай творчасці, гарадскія і раённыя аддзелы культуры, абласныя саветы, прафсаюзаў, фабрычна-заводскія, мясцовыя камітэты і праўленні клубаў, дамоў і палацаў культуры прыняць захады па далейшаму развіццю сеткі кінааматарскіх гурткоў і самадзейных кінастудый, арганізаваць забеспячэнне аматарскіх кінастудый партатыўнай здымачнай апаратурай, тэхналагічным абсталяваннем і кінаматэрыяламі, палепшыць прапаганду самадзейнага кінамастацтва сярод шырокіх мас працоўных.

Кіраўнікам кінастудый «Беларусьфільм» і Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікально-дакументальных фільмаў рэкамендавана ўнесці ў Міністэрства культуры БССР канкрэтныя прапановы аб перадачы самадзейным кінастудыям устарэлага і нявыкарыстанага тэхналагічнага абсталявання.

Культурна-масаваму аддзелу Беларускага савета прафсаюзаў і кіраўніцтву Палаца культуры прафсаюзаў даручана стварыць да 1 студзеня 1962 года пры Палацы цэнтральную студыю кінаматараў.

У пастанове гаворыцца аб тым, каб абласныя ўпраўленні культуры і саветы прафсаюзаў арганізавалі пры абласных і гарадскіх дамах народнай творчасці клубы кінафотааматараў на грамадскіх асновах.

Калегія вырашыла прасіць аргбюро Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР разгледзець пытанне аб арганізацыі больш шырокай творчай і тэхнічнай дапамогі самадзейным кінастудыям з боку прафесіянальных работнікаў кіно; аказаць дапамогу абласным упраўленням культуры, саветам прафсаюзаў і клубам кінааматараў у арганізацыі лекцый і кансультацый па пытаннях кінамастацтва, ва ўкамплектаванні самадзейных кінастудый і гурткоў кваліфікаванымі кадрамі кіраўнікоў.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Ул. І. Леніна павінна падрыхтаваць і разаслаць у першым квартале 1962 года ўпраўленням культуры, абласным бібліятэкам, дамам народнай творчасці, гарадскім і раённым аддзелам культуры рэкамендацыйны спіс літаратуры па мастацка-творчых і тэхнічных пытаннях кінамастацтва, уключыўшы ў яго серыю папулярных брашур, артыкулаў і метадычных дапаможнікаў для самадзейных кінастудый.

Згодна пастановы Упраўленне культасветустаноў Міністэрства культуры і культурна-масавы аддзел Беларускага савета прафсаюзаў сумесна з аргбюро Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР наладзяць у лютым—сакавіку 1962 года семінар кіраўнікоў аматарскіх кінастудый рэспублікі.

Прынята таксама рашэнне аб правядзенні ў 1962 годзе трэцяга рэспубліканскага агляду аматарскіх кінафільмаў.

Падзеі. Факты. Навіны

✦ У Мастоўскім раённым Доме культуры адбыўся вечар моладзі, прысвечаны гістарычнаму XXII з'езду КПСС. Сакратар райкома камсамола В. Саўчанка расказаў прысутным аб тым, як працуюць у гэтыя дні маладыя рабочыя і калгаснікі перадавых сельгасарцелей і прамысловых прадпрыемстваў раёна, аб перспектывах развіцця народнай гаспадаркі Гродзеншчыны ў бліжэйшыя 20 год.

З вялікай увагай было выслухана затым выступленне загадчыцы чытальнай залы раённай бібліятэкі Е. Каткоўскай аб задачах, выстаўленых Праграмай КПСС у галіне ідэалогіі, выхавання, адукацыі, навукі і культуры.

Тэматычныя вечары, прысвечаныя XXII з'езду КПСС, адбыліся таксама ў клубах фанерна-дрэваапрацоўчага камбіната і райпрамкамбіната.

✦ «Мастакі Савецкай Беларусі»—так называецца выстаўка, наладжаная ў Кармянскай раённай бібліятэцы. Экспазіцыя знаёміць наведвальнікаў з творчасцю З. Азгура, З. Паўлоўскага, В. Ціхановіча, А. Шыбнёва, В. Волкава і іншых. На выстаўцы прадстаўлены рэпрадукцыі лепшых твораў беларускіх скульптараў і мастакоў.

✦ Вартаўнік сельскагаспадарчай арцелі імя Дзяржынскага Смалявіцкага раёна Уладзімір Адамавіч Пашукевіч загадвае на грамадскіх асновах перасоўкай кніг ад раённай бібліятэкі. Прапагандыст літаратуры выдае кнігі звыш 130 чытачам, праводзіць гутаркі аб новых творах, калектыўныя чыткі кніг.

Беларускі кінафільм на экране ААН

6 снежня 1961 года прадстаўніцтва БССР пры ААН наладзіла для дэлегацый раду краін праглед беларускага фільма «Дзяўчынка шукае бацьку», які дубліраван на англійскую мову.

На праглядзе кінафільма прысутнічалі члены дэлегацый на XVI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН Афганістана, Бірмы, Кубы, Камбоджы, Ганы, Гвінеі, Ірака, Малі, Саудаўскай Аравіі, Самалі, Судана. Кінафільм быў цёпла сустрэты прысутнымі.

КЛУБ ПІСЬМЕННІКА І ЧЫТАЧА

10 снежня ў Цэнтральным кніжным магазіне горада Мінска адбылося адкрыццё Клуба пісьменніка і чытача.

У той дзень у магазіне было асабліва людна. З уступным словам да аматараў мастацкай кнігі звярнуўся пісьменнік П. Пестрак. Ён пажадаў клубу плённай і шчырай працы на карысць нашай роднай літаратуры. Пісьменнікі І. Мележ, Я. Скрыган, Ул. Карпаў расказалі прысутным аб сваёй працы, аб творчых планах і задумах. У шчырай сяброўскай гутарцы з чытачом прынялі ўдзел пісьменнікі Р. Няхай, А. Пальчэўскі, Н. Кіслік, Е. Лось, А. Дзеружынскі. Яны адказалі на шматлікія пытанні чытачоў, чыталі свае вершы.

Клуб пісьменніка і чытача адкрыты. Наступнае пасяджэнне прызначана на 14 студзеня 1962 года.

На здымку—пісьменнікі А. Дзеружынскі, І. Мележ і А. Пальчэўскі сярод удзельнікаў клуба.

ГОНАР ФРАНЦУЗСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Вядомы французскі пісьменнік Гюстаў Флабер, які заняў ганаровае месца ў гісторыі французскай і сусветнай літаратуры, пісаў свае творы ў складаны перыяд гісторыі. Гэты перыяд характарызуецца пачаткам дэградацыі буржуазнай культуры, калі буржуазія траціць усе рэшткі сваёй былой рэвалюцыйнасці і сканцэнтроўвае сілы для барацьбы супраць пралетарыяту, а пралетарыят збірае свае сілы пад сцягам І Інтэрнацыянала і са зброяй у руках выступае на барыкадах Парыжскай Камуны.

Гюстаў Флабер выразна бачыў крызіс буржуазнага грамадства і яго культуры. Аднак ён не мог зразумець гістарычнай ролі пралетарыяту як магільшчыка буржуазіі і стваральніка сацыялістычнага грамадства. Адсюль той песімізм, які афарбоўвае многія творы выдатнага французскага пісьменніка, неразуменне ім перспектыў чалавечага прагрэсу. У пісьме да свайго сябра Луі Буйле Флабер пісаў: «Што нам за справа да таго, як будзе выглядаць заўтрашні дзень? Мы бачым, як выглядае сённяшні. Ён даволі грымаснічае...»

Праз усю творчасць Флабера праходзіць тэма страчаных ілюзій. Гіне ў шасках буржуазнага грамадства Эма Бавары, не знаходзіць свайго шчасця карфагенянка Саламбо, траціць ідэалы свайго юнацтва Фрэдэрык Маро—герой рамана «Выхаванне пачуццяў».

У сваіх эстэтычных поглядах Флабер прытрымліваўся супярэчлівай тэорыі. Палемізуючы з рэакцыйнымі рамантыкамі і асуджаючы іх «суб'ектыўны рамантызм», адарваны ад рэальнага жыцця, Флабер проціпастаўляў ім метад «аб'ектыўнага рэалізму», памылкова мяркуючы, што справа пісьменніка заключаецца толькі ў аб'ектыўна правільным адлюстраванні жыцця, без усялякай ацэнкі «Мастак павінен уладкавацца так, —пісаў Флабер,— каб нашчадкі думалі, што ён не існаваў». У адным са сваіх пісем Гюстаў Флабер выказаў думку, што раманіст не мае права выказваць сваёй думкі з прычыны чаго б там ні было.

Аднак практычна, як вялікі пісьменнік, Флабер не быў сузіральнікам, які піша «добру и злу внимая равнодушно», а вельмі рэзка крытыкаваў ненавісныя для яго буржуазныя парадкі.

У гісторыі французскай і сусветнай літаратуры Флабер вядомы як вялікі майстра, тонкі стыліст, які стварыў дасканалыя мастацкія творы. А. М. Горкі, які яшчэ ў юнацтве захапляўся апавяданнем Флабера «Простае сэрца», здзіўляўся надзвычайнаму майстэрству французскага пісьменніка.

Горкі ахарактарызаваў Флабера як найвялікшага майстра мастацкай формы, як бліскучага стыліста, вялікага знаўцы мовы, як яркага прадстаўніка «вялікай французскай літаратуры».

Літаратурная спадчына Флабера параўнальна невялікая. Некалькі раманаў, апавяданняў і нарысаў. Аднак сярод гэтых «некалькіх раманаў» такія шэдэўры, як «Пані Бавары», а сярод апавяданняў—памянёнае ўжо апавяданне «Простае сэрца».

Вялікае значэнне маюць шматлікія пісьмы Флабера, у якіх ён не толькі выкладае свае эстэтычныя погляды, але нібы прыадкрывае заслону над «лабараторыяй» сваёй творчасці.

Флабер працаваў штодзённа і па шмат гадзін у дзень. У сярэднім над кожным раманам ён працаваў шэсць-сем год. Шмат часу ён траціў на збіранне матэрыялу. Ён накапляў стос дакументаў, запісаў, выпісак, чытаў вельмі многа кніг на тэму свайго чарговага рамана. Для напісання невялікай аповесці «Легенда пра святога Юліяна Міласцівага» ён праштудзіраваў 300 спецыяльных кніг, прац і трактатаў. Для работы над раманам «Бувар і Пекюшэ» яму спатрэбілася ўважліва прачытаць 1 500 кніг пра розныя галіны чалавечых ведаў. А для напісання гістарычнага рамана «Саламбо» Флабер спецыяльна паехаў у Паўночную Афрыку, у тыя самыя месцы, дзе некалі знаходзіўся Карфаген. А для таго, напрыклад, каб апісаць у рамане «Пані Бавары» невялікую сцэну аперацыі, якую робіць доктар Шарль Бавары, Флабер прысутнічаў пры аналагічнай аперацыі ў руанскай бальніцы.

Прарабіўшы велізарную папярэднюю работу, Флабер старанна апрацоўваў творы стылістычна. Яны вызначаюцца строгай кампазіцыяй, дасканалай апрацоўкай кожнай дэталі, кожнага слова.

Флабер вызначаўся выключнай працавітасцю і працаздольнасцю. «Я чалавек-пяро,—пісаў ён у адным са сваіх пісем,—я існую дзеля яго, з-за яго, пры дапамозе яго. Я больш за ўсё жыву з ім».

У другім пісьме ён паведамляў, што тыднямі не выходзіць з дому, працуючы над новым творам.

Гэтая ўпартая праца ў спалучэнні з талентам дала свае вынікі. І творы Флабера, як адзначаў Горкі, гэта—узоры дасканалай мастацкай формы.

Найбольш ярка майстэрства Флабера праявілася ў яго лепшым рамане «Пані Бавары», у якім звычайная гісторыя сямейнай здрады набывае характар сімвалічнага абагульнення выраджэння буржуазнага грамадства ў Францыі 40—50-х гадоў XIX стагоддзя.

Прычына гібелі і расчаравання Эмы Бавары заключаецца не толькі ў яе сардэчных перажываннях, не толькі ў разладзе паміж яе рамантычным уяўленнем аб жыцці і пошлай рэчаіснасцю, у якой яна жыла. Яе трагедыя абумоўлена ўсёй прыгнятаючай атмасферай тагачаснай Францыі, увасабленнем якой з'яўляюцца аптэкар Амэ, дваранін Радольф Буланжэ, ліхвяр Лерэ, свяшчэннік Бурынсьён. Усе гэтыя вобразы намаляваны Флаберам па-майстэрску: ярка, каларытна і выпукла.

Прачытаўшы гэты выдатны раман, мы надоўга запамінаем трагічны вобраз Эмы Бавары—«маладую жанчыну ў сіняй шарсцяной сукенцы з трыма фальбонамі», потым аўтар малюе яе вонкавае аблічча і, нарэшце, мы бачым у дэталях яе партрэт, поўны жаночай грацыі і прывабнасці. Як вялікі псіхолаг, глыбока правікае Флабер у тайнікі яе сэрца. «Чалавечае сэрца невыпадковае,—пісаў Флабер,—гэта артэзіянскі калодзеж, варта пачаць яго капаць, як адтуль заструменіць».

Калі Флабер ствараў той ці іншы вобраз, ён нібы пераўвасабляўся сам у свайго персанажа і сам перажываў яго трывогі і хваляванні. Вось чаму ён пісаў, што «Эма Бавары—гэта я».

Надоўга запамінаем мы і вобраз доктара Шарля Бавары, пра якога аўтар рамана сказаў, што «размовы Шарля былі плоскія, як вулічная панель». І гэтых слоў дастаткова, каб зразумець, што сабою ўяўляе Шарль Бавары. Або вобраз «маленькага вялікага чалавека Іянвіля»—аптэкара Амэ, які лічыў сябе паслядоўнікам Вальтэра, а быў на самай справе абмежаваным правінцыялам, эгаістам, балбатуном і пашляком.

Адзначаючы сёння 140 год з дня нараджэння Гюстава Флабера, мы цэнім у ім выдатнага пісьменніка-рэаліста, які закліканы ў сваіх творах усю пошласць буржуазнага грамадства, стваральніка твораў, якія сталі класічнымі ўзорамі пісьменніцкага майстэрства і дасканалай мастацкай формы.

Н. ЛАПІДУС,
кандыдат філалагічных навук.

ЗМЫВАЮЧЫ ГРЫМ

ЗВЯРЫ НА ПУСТЫРЫ

(БАЙКА)

«З-за ўзнікшых унутраных рознагалосяў сёмы кангрэс сацыялістычнага Інтэрнацыянала так і не здолеў прыняць дэкларавацую праграму міжнароднай сацыял-дэмакратыі. Між тым сацыял-здраднікі тыпу Гі Мале, Аскара Полака, Гейтскела ўскладалі на гэты дакумент вялікія надзеі як на «адказ камунізму».

(З газет).

Звяры сабраліся аднойчы ля ракі
Абмеркаваць балючае пытанне:
Таўчэмся тут на пустыры,
а на той бок дык хто ні гляне,—
Мурог, шчаўё, зялёныя дубкі —
Яды для кожнага там стане.

І вырашылі: пабудуем мост!
За будаўніцтва ўсе галасавалі.
А наб той мост, як трэба, рос,
Тэхнічную камісію абралі.
За старшыню — Асёл.
Ліса і Заяц — члены.
Ім выдзялілі стол,
Далі ім мяса, сена.
Калі ж яны ўсё гэта з'елі,
За стол аўтарытэтна селі.
Асёл з калегамі стаў раіцца,
Перш-наперш запытаў ён Зайца.
Той важна скасавурыў вока,
Вакол стала аббегшы скокам:
— Мост трэба будаваць, напэўна, так,
Каб ён ішоў праз рэчку наўскасяк.
Пытанне да Лісы. А тая круціць задам:
— Па-мойму, будаваць нам трэба мост зігзагам...
— Бадай што, слушныя абедзве прапановы,—
Сказаў Асёл. — Вы раіць мастакі.
Ды трэба вырашыць спачатку прынцыпова:
Як будаваць—уздоўж, ці ўпоперак ракі.

На сходзе ўсезвярыным
Гэтае пытанне
Пастаўлена камісіяй
Зноў
на абмеркаванне.

І зноў на пустыры сабраліся звяры.
Зноў з тымі ж прапановамі не новымі...
Ды пэўна што, шаноўныя сябры,
Масты праектаваць —
не з вашымі галовамі.

Рыгор ЖЫТНЫ.

НОВЫ ВАЯЖ, ДЫ СТАРЫ БАГАЖ

ДА ВЫНІКАЎ ПАЕЗДКІ АДЭНАЎЭРА Ў ЗША.



БУНДЭСВерталёт вяртаецца на сваю базу.

Мал. М. Жытніцкага.

ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

Факты з зарубежных газет і часопісаў

«НАВУКОВЫЯ» КАНСУЛЬТАНТЫ

Губернатар штата Алабама нядаўна ўвёў у склад свайго ўпраўленцкага апарату двух навуковых кансультантаў — аднаго ўрача і аднаго юрыста для збірання матэрыялаў аб перавазе белай расы над іншымі. На думку губернатара, дзейнасць гэтых кансультантаў дапаможа захаваць расавы падзел у яго штаце.

«Морген».

НА СМЕТНІКУ ГІСТОРЫІ

У Англіі адбыўся першы міжнародны манархічны кангрэс. Прэзідэнтам кангрэса выбран яго высокасць барон Джыявані ды Джыра, які быў раней сакратаром па геральдычных справах экс-караля Італіі Умберто. Сакратаром выбран бірмінгамскі юрыст Вінсент Пауэл-Сміт. У прынятым на кангрэсе маніфесце ўказваецца: «Неадкладнай задачай сучаснага манархічнага руху з'яўляецца не толькі ўстанаўленне больш цеснага міжнароднага супрацоўніцтва паміж манархістамі, але і грунтоўнае вывучэнне прынцыпаў і філасофіі манархізму, а таксама праблем, якія паўстаюць перад манархізмам у XX стагоддзі».

«Дэйлі Уорнер».

ЗА АДЗІН ТЫДЗЕНЬ

«144 забойствы, 143 замахі на забойства, 14 выпадкаў атручвання, 12 уцёкаў злачынцаў з турмаў, 36 узброеных нападаў з мэтай абрабавання, 6 крадзяжоў, 18 выкрадванняў дзяцей, 6 крадзяжоў з узломам, 7 катаванняў, 11 выпадкаў вымагальніцтва, 11 выпадкаў падрыхтоўкі да забойства, 4 лінчаванні, адна сцэна разні з сотнямі трупаў і тры перастрэлкі паміж бандамі гангстэраў убачылі тэлегледачы Лос-Анжэласа на працягу аднаго тыдня».

Гэтыя дадзеныя ўзяты са справаздачы «Амерыканскага нацыянальнага аб'яднання за паляпшэнне радыё- і тэлеперадач».

«Морген».

ПАЛІЦЫІ НЯМА ЧАСУ

Паводле дадзеных мюнхенскага паліцэйскага ўпраўлення, за апошні час значна павялічылася колькасць абрабаванняў і згвалтаванняў жанчын і дзяўчат, асабліва амерыканскімі ваеннаслужачымі. Паліцыя не ў стане аддаваць гэтым злачынствам дастаткова ўвагі, таму што ёй даводзіцца займацца палітычнымі справамі.

«Вохенпост».

ЗА ЧЫСЦІНЮ РАСЫ

«Дзяўчаты Паўднёвай Ціролі! Памятайце аб сваёй сацыяльнай прыналежнасці і не дапускайце ніякіх адносін з італьянцамі! Інакш вы пашкодуеце аб гэтым! Змешаныя шлюбы — смерць для нацыі!»

Такія плакаты распаўсюджваюцца ў паўднёвых абласцях Заходняй Германіі.

«Фольксштымме».

НА ЎСЯКІ ВЫПАДАК...

Адзін з лонданскіх краўцоў пачаў выпускаць камізэлькі, якіх не прабіваюць кулі. Гэтыя камізэлькі нагадваюць сярэдневяковую кальчугу і карыстаюцца вялікім попытам. Сярод заказчыкаў многа высокапастаўленых асоб не толькі з Англіі, але і з іншых капіталістычных краін. Імёны апошніх захоўваюцца ў тайне.

«Юманітэ».

У ГВІНЕІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Раптам аднекуль з-за бліжэйшай хаты выскачыла хэўра новых хлапчукоў на чале з гарэзнай і спрытнай дзяўчынкай і пачала разганяць тых, што ахвотна і спакойна здымаліся.

Адразу я накіраваў аб'ектыў і на іх.

Убачыўшы гэта, дзеці пачалі махаць рукамі, выстаўляць наперад кулакі, крыўляцца, скакаць, строіць усялякія міны і грымасы. Асабліва заўзята выкручвалася гарэзная дзяўчынка на першым плане.

Маладая жанчына ў сінім цюрбане з дзіцем на руках, якая стаяла перад хатай і з усмешкай глядзела на выхадкі гарэзнікаў, павярнулася ў гэты момант да апарата спіной.

У такім выглядзе ўсе яны і трапілі на плёнку.

Яшчэ зусім нядаўна многія бацькі-мусульмане вельмі неахвотна аддавалі сваіх дзяцей у школу. Ім здавалася, што дзецям дастаткова наведваць рэлігійную школу, дзе ўсё навучанне заключаецца ў механічным завучванні на памяць незразумелых арабскіх тэкстаў.

Маленства тут яшчэ нядаўна канчалася вельмі рана. Дзяўчынкі ў дванаццаць год выходзілі замуж. Хлопцы жаніліся ў шаснаццаць год. Заручыны адбываліся ў сямі-васьмігадовым узросце, па дагаворанасці між бацькамі малых жаніха і нявесты.

Да абвяшчэння незалежнасці ва ўсёй Гвінеі было толькі дзесяць сярэдніх школ і адно тэхнічнае вучылішча. За апошнія тры гады ў краіне пабудаваны сотні новых школ. Цяпер навучанне ў школе з'яўляецца абавязковым. Усім дзецям у школах робяцца прышчэпкі супраць воспы і жоўтай ліхаманкі. Амаль усе дзеці з'яўляюцца піянерамі.

ЗЯМЛЯ, ПАЛЬМЫ І ТРАКТАРЫ

У самой вёсцы і вакол яе растуць какосавыя і маслічныя пальмы. Гэтыя прыгожыя дрэвы маюць у жыцці афрыканцаў вялікае значэнне.

Асаблівую карысць дае чалавеку какосавая пальма.

Малако какосавых арэхаў п'юць. З мякаці арэхаў, капры, вырабляюць какосавы алей. Жорсткія валокны ідуць на вяроўкі, шчоткі, цыноўкі. Лісце — на стрэхі.

Ствалы выкарыстоўваюцца як будаўнічы матэрыял. З іх робяць таксама і лодкі-пірогі, зброю, розныя прылады. Пальмавы сок дае віно. Маладыя парасткі, «пальмавую капусту», ядуць.

Адным словам, какосавую пальму нездарма называлі раней «універсальным магазінам» трапічных краін.

Плады гэтай прыгажуні не тонуць, не гінуць і не псуюцца ў салёнай марской вадзе. Хвалі акіяна выкідвалі і выкідваюць какосавыя арэхі часам на вельмі далёкія берагі, за тысячы кіламетраў ад таго месца, дзе яны выраслі. Вось чаму какосавая пальма распаўсюдзілася з незапамятных часоў ва ўсіх трапічных краінах свету.

Буйную ролю адыгрывае ў народнай гаспадарцы афрыканскіх краін і гвінейская маслічная пальма. З пладоў маслічнай пальмы вырабляюць харчовы і тэхнічны алей. Апошні выкарыстоўваецца ў парфюмернай і мылаварнай прамысловасці, а таксама для вырабу розных лакаў і фарбаў. З соку гэтай пальмы, як і з какосавага, робяць віно.

Радзіма маслічнай пальмы — Гвінея. Адсюль яна распаўсюдзілася па ўсіх краінах Афрыкі, па астравах Інданезіі, па Паўднёвай Амерыцы.

Каля вёскі Койя высіцца цэлы гай і маслічных, і какосавых пальм. Тут, на гэтай зямлі з шалёнай, казачнай урадлівасцю ўсё расце, квітнее і спее адначасова і безупынна на працягу ўсяго года. Але глеба хутка знясільваецца, бо ўгнаеннямі мясцовае насельніцтва ніколі не карыстаецца. Зямлю гвінейцы апрацоўвалі да апошняга часу самым прымітыўным спосабам, старажытнымі матыкамі — «даба», як і тысячы год назад.

Цяпер, пасля таго, як Гвінея зрабілася незалежнай, узровень сельскай гаспадаркі ў краіне няўхільна павышаецца.

На землях, якія раней належалі каланізатарам і мясцовым феадалам, створаны дзяржаўныя гаспадаркі з плантацыямі бананаў, ананасаў, кавы, какао, апельсінаў.

Усюды ўзніклі кааператывы па сумеснай апрацоўцы зямлі. Гвінейцы пачынаюць карыстацца трактарамі. Імі забяспечваюцца ў першую чаргу дзяржаўныя гаспадаркі, якія з'яўляюцца прыкладам умелага выкарыстання механізаванай тэхнікі. У вёсках вылучаюцца асобныя ўчасткі, прыбыткі з якіх ідуць на грамадскія патрэбы і набыццё сучаснага абсталявання.

АЭРАПОРТ І ГЛІНЯНЫЯ ХАТКІ

З вёскі Койя мы вярнуліся ў Канакры, заехаўшы па дарозе ў сталічны аэрапорт, які знаходзіцца ў кіламетрах шасці ад горада.

Побач з выдатнымі праявамі дасканалай сучаснай тэхнікі, прамысловасці і цывілізацыі мы ўбачылі і тут, нібы для параўнання, прымітыўнае жыццё чалавека, якое не змянілася на працягу дзесяткаў тысяч год.

Недалёка ад цудоўна, па-еўрапейску абсталяваных памяшканняў аэрапорта туліліся пад купаю дрэў сярод травяной савана гліняныя хаткі афрыканцаў з саламянымі стрэхамі. Яны нагадвалі стагі сена пасярод скошанага лугу.

Прыехаўшы ў горад, мы развіталіся з праваднікам і шафёрам.

Па традыцыі, якая ўстанавілася ў турыстаў, мы падарылі ім па бутэльцы маскоўскай «сталічнай» і па драўлянай фарбаванай ляльцы — «матрошцы».

— Перадайце, калі ласка, наша шчырае прывітанне вашай цудоўнай радзіме і ўсім вашым блізкім, — сказаў Анры і ў голасе яго мы адчулі сапраўды цёплае, сяброўскае пачуццё.

Шафёр ківаў у знак поўнай згоды сваёй чорнай кучаравай галавой, шырока ўхмыляўся бліскучымі белымі зубамі і, паціскаючы нам рукі, паўтараў:

— Прыязджайце да нас яшчэ раз, камрад!.. Прыязджайце!.. Прыязджайце!..

РЫБА-МОЛАТ І РЫБА-ПІЛА

Сёння — апошні дзень нашага знаходжання ў Гвінеі.

Заўтра раніцай наш цеплаход пакіне зялёныя берагі Заходняй Афрыкі.

Калі мы вярталіся ў порт позна вечарам, стаміўшыся ад блуканняў па цёмных вуліцах Канакры, нас паклікала ля прычала група маладых гвінейцаў:

— Камрад, добры вечар!.. Хадзіце сюды!.. Мы вам нешта пакажам!..

Мы падышлі.

— Глядзіце!..

Гвінейскія рыбакі паказалі нам вылаўленую імі сярод іншай марской здабычы рыбу-молат і даўгі нос рыбы-пілы.

Рыба-молат!..

Раней я бачыў гэтую дзіўную акіянскую рыбіну толькі на малюнках. Цяпер я мог разгледзець яе, дакрануцца да яе рукамі.

Галава ў яе сапраўды мае форму шырокага малатка. Вочы — жоўтыя, далёкія адно ад аднаго, па боку на кожным супрацьлеглым баку галавы-малатка. Унізе, пад галавой, недзе каля самога бруха, знаходзіцца пашча ў выглядзе падковы з некалькімі радамі доўгіх, вострых зубоў.

Я памацаў дзівосную рыбіну.

Скура ў яе жорсткая, як наждак. Такая ж, як і ў акулы. І колер такі самы — зверху брудна-шэры, знізу — светлы. І формай цела рыба-молат падобная на акулу. Калі б не дзіўная галава, цяжка было б адрозніць.

Рыба-молат невялікая, даўжынёй метра паўтара. Затое вострая «піла», адсечаная ад галавы рыбы-пілы, была даўжэйшая за самую даўгую сапраўдную пілу дрывасека.

Дзе падзелася сама рыба, гвінейцы нам нічога не сказалі. Зразумела, вялі яе, зразумела, не каля берагу, бо рыба-піла жыве ў акіяне на вялікіх глыбінях.

Мы чулі яшчэ раней, што рыбакі атлантычнага ўзбярэжжа Афрыкі вядомы сваёй адвагай і вялікім вопытам. На вузкіх лодках-пірогах яны заплываюць далёка ў адкрытыя прасторы акіяна.

Мы стаялі сярод чырвоных гор баксітаў, прывезеных сюды для экспарту, мяшкоў з кітайскім рысам і скрынак з нямецкім півам, выгружаных з карабля, і разглядалі здабычу гвінейскіх рыбакоў, асветленую маладзіком і партовымі ліхтарамі.

Рыбакі хацелі нам даць рыбу-молат на памяць.

Можа і не блага было б узяць яе з сабою ў Мінск, паказаць сябрам і знаёмым? Ды хіба такую давязеш?

Мы падзякавалі і адмовіліся.

Нарэшце, адзін з нашых спадарожнікаў узяў «пілу».

Рыбакі былі гэтаму вельмі рады. Яны безупынна хлопалі нас па плячах, паціскалі рукі і паўтаралі па-руску сваё традыцыйнае:

— Добры вечар!..

Чорныя твары іх расплываліся ў начной цемры. Толькі белыя зубы зіхацелі ў шырокай усмешцы.

Гаспадар «пілы» добрасумленна цягнуў свой набытак па ўрапу. Жартуючы мы называлі «пілу» расчоскай і раілі нашаму сябру касіць яе ў кішэні. Але ён пакінуў свой экзатычны «сувенір» на палубе, пад шлюпкай, каб «піла» там праветрылася як след.

Спачатку яна пахла не вельмі прыемна, але праз некалькі дзён добра падсохла. Цяпер ужо можна было смела засунуць яе за шафу ў каюце.

У далейшым «піла» рыбы-пілы, дбайна запакаваная ў газеты і абкручаная вяроўкамі, была без асаблівых перашкод дастаўлена ў Мінск.

Такой незвычайнай «пілы» напэўна ніколі яшчэ не было ў нашым горадзе!

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. | АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва— 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03. | «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00488

Друкарня выдавецтва «Звязда».